Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 167 (5841) | 22 ліпеня 1937 г., чацвер | ЦАНА 10 КАП.

Всесоюзная библиотека имени В. И. Ленина

Пролетарыі усіх краін, злучайцеся!

СЕННЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ:

Перадавы — За большэвіцкую якасць радыёвяшчання.

В. Калеснік — Шпіёнскі інтэрнацыянал — 3 стар.

А. Сакалоўскі — Выбарчы закон краіны соцыялізма і выбарчыя парадкі ў фашысцкай Польшчы — 2 стар.

Ліўшыц, Рыўкін — Партыйная прапаганда — у цэнтры ўвагі партыйных сходаў — 3 стар.

І. Турэцкі — Ці толькі бесклапотнасць? — 2 стар.

П. Х. — Да навучальнага года рыхтавацца зараз — 3 стар.

Учора ў Маскве адкрыўся XVII Міжнародны геалагічны кангрэс — 1 стар.

ЗА РУБЯЖОМ

На франтах у Іспаніі. Прабыванне совецкіх лётчыкаў у ЗША. Ваенна-паветранае свята ў Францыі — 1 стар.

ЗА БОЛЬШЭВІЦКУЮ ЯКАСЦЬ РАДЫЁВЯШЧАННЯ

У капіталістычным свеце радыё — гэтае велізарнейшае дасягненне культуры — служыць інтарэсам буржуазіі. Эксплаататары ўсяго свету скарыстоўваюць гэты магутны апарат агітацыі ў інтарэсах умацавання сваёй улады, у інтарэсах пашырэння буржуазнага ўплыву на рабочыя і сялянскія масы.

Толькі ў СССР радыё служыць справе народу, з'яўляючыся фактарам магутнага росту культуры. У арсенале барацьбы за умацаванне дыктатуры пролетарыята радыё займае пачэснае месца.

За апошнія гады наша соцыялістычная прамысловасць аснасціла радыёвяшчанне перадавой тэхнікай, стварыла небывалы рост радыёсеткі. Магутнае большэвіцкае слова, усебаковая інфармацыя аб міжнародным і ўнутраным становішчы СССР, лепшыя творы літаратуры і мастацтва, гучаючы радыё, хутка пранікаюць у масы, у самыя далёкія куткі нашай неабсяжнай краіны.

Радыё карыстаецца заслужанай любоўю навагаю шматмільённых мас совецкіх грамадзян. Аднак, рост радыёвяшчання значна адстае ад запросаў мас. Буйнейшыя зрывы, памылкі і недахопы, што ёсць у радыёвяшчанні, сведчаць пра тое, што ў радзе месц гэты ўчастак запушчан да крайнасці.

Найярчэйшым пацвярджэннем таго, да якіх сумных вынікаў прыводзіць бескантрольнасць радыёвяшчання і палітычная бясклопатнасць на гэтым участку, могуць служыць справы Радыёкамітэта БССР. На трапягу году год на вачах СНК БССР чыім органам з'яўляецца Радыёкамітэт) пры падтрымканні ворагаў народу, якія пралезлі ў партыйны апарат, у Радыёкамітэце БССР арудавалі трацкісты, нацдэмы розных колераў і іншая контррэволюцыйная нечысць. Верхаволы гэтай гнуснай граі былі выкрыты і абясшкоджаны, але карэнні іх падрыўнай дзейнасці да канца яшчэ не вырваны.

Новае кіраўніцтва Радыёкамітэта (тав. Гарачоў) надзвычай марудна і недастатково рашуча перабудоўвае работу камітэта, прыбягаючы часам толькі да поўмер у адносінах да ўмацавання апарата надзейнымі, праверанымі кадрамі.

Трацкісцкае і нацдэмаўскае ахвоспе ўжо ды новым кіраўніцтве, неалнаразова і не без поспеху, прабавала выкарыстаць радыёвяшчанне ў сваіх контррэволюцыйных мэтах. Рукамі ворагаў у радзе раёнаў СССР была сарвана трансляцыя па радыё гістарычнага даклада таварыша Сталіна аб праекце Канстытуцыі СССР. Аднак гэты абураючы факт наглай вылазкі ворага доўгі час аставаўся без належнага рэагавання. Не менш абураючы факт перадачы Менскай радыёстанцыяй, пад выглядам канцэрта, жалобнай музыкі следам за абвінавачым заключэннем па справе трацкісцка-зіноўеўскай банды. Далёка не рэдкі выпадкі выключэння актуальных перадач па так званых «тэхнічных» прычынах, за якімі хаваецца наглая морда ворага.

Засмечанасць апарата Радыёкамітэта варожымі, чужымі і выпадковымі элементамі, расхлябанасць і безадказнасць апарата адбіваецца на якасці вяшчання. Праграмы перадач у большасці выпадкаў складаюцца наспех або парушаюцца самімі-ж складальнікамі іх. Такая-ж важная перадача, як «Апошнія паведамленні», нярэдка дубліруе газеты. Дыктары чытаюць затэрыял некультурна, скажаюць мову. Нізкая ідэйная і мастацкая якасць вяшчання асабліва рэзка адчуваецца ў дзіцячых перадачах і ў перадачах на яўрэйскай і польскай мовах.

На Радыёкамітэт БССР усклазены функцыі арганізацыі радыёвяшчання ў рэспубліцы. Практыка работы Менскай радыёстанцыі, зусім нездавальняючае становішча мясцовага вяшчання паказваюць, што Радыёкамітэт з гэтай сваёй асноўнай функцыяй не спраўляецца. У «Звяздзе» не раз публікаваліся сігналы з месц — пісьмы радыёслухачоў аб дрэннай рабоце радыёвузлоў раёнаў. За апошні час у Жыткавіцкім, Церахоўскім, Бярэзінскім і ў радзе іншых раёнаў органамі НКВД выкрыты ворагі, якія знайшлі сабе прытулак у мясцовым радыёвяшчанні. У Жлобінскім раёне па матэрыялах рабкораў «Звязды» ўскрыты контррэволюцыйныя вылазкі на радыёвузле. Здавалася-б, што кіраўніцтва Радыёкамітэта неадкладна зробіць належныя вывады з гэтых спраў і прыме меры да ўмацавання мясцовага вяшчання. Аднак кіраўнік камітэта т. Гарачоў абмежаваўся агульнымі разважаннямі і пры гэтым зусім безгрунтоўна ліквідаваў адзел мясцовага вяшчання камітэта. Зараз у камітэце мясцовым вяшчаннем фактычна ніхто не кіруе.

Схід актыва Радыёкамітэта, што адбыўся нядаўна, па сутнасці, у яго рабоце ніякіх змен, у бок паляпшэння, не зрабіў.

Няўменне зрабіць большэвіцкія вывады з фактаў падрыўнай дзейнасці класавага ворага і яго агентуры ў радыёвяшчанні, выключная палітычная бясклопатнасць на гэтым участку, адарванасць ад мас і нежаданне па-сапраўднаму прыслухацца да іх голасу, — усе гэтыя і падобныя ім парокі ў рабоце Радыёкамітэта абсалютна непярпімы! Яго кіраўніцтва абавязана рашуча адмовіцца ад поўмер і неадкладна заняцца карэнным паляпшэннем радыёвяшчання зверху данізу. Неабходна перш за ўсё аздаравіць апарат камітэта, умацаваўшы яго лепшымі, праверанымі кадрамі партыйных і непартыйных большэвікоў. Трэба смялей вылучаць і рыхтаваць новыя кадры!

У самы бліжэйшы час павінна быць ліквідавана абзялічка ў кіраўніцтве мясцовым вяшчаннем. Радыёкамітэт абавязан усебакова палепшыць работу радыёвузлоў у раёнах, на прадпрыемствах, у саўгасах і калгасах.

Пры гэтым асобую ўвагу неабходна ўдзяліць пагранічным раёнам. У іх работа вузлоў павінна быць прыкладам умелага выкарыстання тэхнікі і арганізацыі высокаякаснага вяшчання.

Раённым камітэтам партыі таксама трэба шчыльна заняцца паляпшэннем работы радыёвузлоў свайго раёна, аказаць Радыёкамітэту максімальную дапамогу ў гэтым, асабліва ў справе падбору кадраў. Радыёвузел павінен стаць неадлучнай часткай агітацыйнай і прапагандысцкай работы партарганізацыі.

Зараз, калі ўся краіна Советаў рыхтуецца да выбараў у Вярхоўны Совет СССР, радыё павінна адыграць асабліва вялікую ролю, яго трэба скарыстаць у поўнай меры. Гэта неабходна добра засвоіць работнікам радыёвяшчання, кіраўнікам мясцовых партарганізацый.

Наладжанне ўзорнага радыёвяшчання, ліквідацыя маўчачых радыёўстановак і хрышчэйшых перадач — гэта сугуба важнае палітычнае мерапрыемства, ад якога шмат будзе залежаць поспех агітацыйнай работы на надыходзячых выбарах у Вярхоўны Совет.

Радыёвяшчанне, ачышчанае ад ахвоспаў ворага, умаванае праверанымі кадрамі, павінна поўным голасам неслі ў масы баявыя лозунгі партыі Леніна—Сталіна. Барацьба за большэвіцкую якасць радыёвяшчання павінна стаць справай гонару работнікаў гэтага фронту, важнейшым участкам работы партарганізацый.

УЧОРА У МАСКВЕ АДКРЫЎСЯ XVII МІЖНАРОДНЫ ГЕАЛАГІЧНЫ КАНГРЭС

АДКРЫЦЦЁ КАНГРЭСА

Учора ў Маскве адбылося ўрачыстае адкрыццё XVII сесіі Міжнароднага геалагічнага кангрэса. Віднейшыя совецкія і замежныя геолагі, прадстаўнікі сотняў геалагічных устаноў 50 краін, работнікі геалагічнай разведкі, дэлегаты сусветнай арміі нястомных даследчыкаў прыродных багаццяў, захаваных у нетрах зямлі, запоўнілі Вялікую залу Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі.

Вялікая зала па-святочнаму афармлена. На эстрадзе — бюсты Леніна і Сталіна ў зеляніне і кветках; надпісы на шасці мовах паўтараюць словы правадыра народаў аб навуцы, якая не прызнае фетышаў. Белы герб СССР чотка вызяляецца на фоне велічэзнага чырвонага палотнішча. Шматкаляровая падрабязная геалагічная карта СССР, змешчаная ззаду стала прэзідыума, дае выразнае ўяўленне аб велізарнай эканамічнай магутнасці краіны, запрасіўшай геолагаў усяго свету на гэтае міжнароднае свята навукі, аб невычарпальных вытворчых сілах краіны пераможнага соцыялізма.

Раніцай, да адкрыцця сесіі, у гэтай зале засядаў совет кангрэса, у склад якога на гэтай сесіі ўвайшло 82 чалавекі — 7 прадстаўнікоў оргкамітэта па скліканню кангрэса, члены ўрадавых дэлегацый, кіраўнікі геалагічных служб, прадстаўнікі Акадэміі і інш.

К 11 гадзінам раніцы ўсе члены кангрэса сабраліся ў зале. Месцы за сталом прэзідыума займаюць — народны камісар цяжкай прамысловасці СССР тав. В. І. Межлаук, акадэмікі І. М. Губкін і Н. П. Гарбуноў, галава амерыканскай дэлегацыі на кангрэсе Філіпс Сміт.

Па традыцыі першае пасяджэнне сесіі кангрэса павінен адкрываць прэзідэнт ранейшай сесіі кангрэса. Прэзідэнт XVI вашынгтонскай сесіі праф. Ліндгрэн, які не змог з-за хваробы прыбыць на кангрэс, перадаў свае паўнамоцтвы **Філіпу Сміту.**

Галава амерыканскай дэлегацыі Сміт выступае з уступнай прывітальнай прамовай і абвяшчае XVII сесію Міжнароднага геалагічнага кангрэса адкрытай. Затым ён прадастаўляе слова народнаму камісару цяжкай прамысловасці СССР тав. В. І. **Межлауку,** паяўленне якога на трыбуне члены кангрэса сустракаюць доўгімі апладысментамі. Калі тав. Межлаук, гаворачы аб рабоце совецкіх вучоных, вымаўляе імя лепшага друга навукі, любімага правадыра працоўных усяго свету — таварыша Сталіна, члены кангрэса доўга апладыруюць стоячы.

Пасля прамовы тав. В. І. Межлаука слова бярэ акадэмік Н. П. **Гарбуноў,** які ад імя совета кангрэса прапануе на зацвярджэнне сесіі кандыдатуры членаў прэзідыума кангрэса. Па прапанове совета, кангрэс аднадушна выбірае сваім прэзідэнтам віцэ-прэзідэнта Акадэміі навук СССР акадэміка І. М. Губкіна, віцэ-прэзідэнтамі — кіраўнікоў усіх урадавых дэлегацый, генеральным сакратаром кангрэса — акадэміка Н. П. Гарбунова.

Доўгімі апладысментамі члены кангрэса сустрэлі прапанову Совета кангрэса, агалошаную І. М. Губкіным, — **выбраць ганаровым прэзідэнтам XVII сесіі кангрэса старшыню ЦВК Саюза ССР Міхаіла Іванавіча Калініна.** Гэта прапанова прымаецца кангрэсам аднадушна.

Нававыбраны прэзідэнт кангрэса акадэмік І. М. Губкін выступіў з прывітальнай прамовай, у якой каротка абрысаваў задачы і значэнне кангрэса.

На трыбуну падняўся галава Акадэміі навук СССР акадэмік В. Л. **Камароў.** Акад. В. Л. Камароў выказаў упэўненасць у тым, што гэтая сесія кангрэса паслужыць стымулам для новых поспехаў геалагічнай навукі.

У заключэнне ўрачыстай часткі пасяджэння слова атрымаў старэйшы геолаг СССР, галава совецкай урадавай дэлегацыі на кангрэсе — акадэмік В. А. **Обручэў.**

ПРАМОВА В. І. МЕЖЛАУКА

Урад Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік даручыў мне вітаць Вас,—членаў XVII Міжнароднага геалагічнага кангрэса, прадстаўнікоў тэорыі і практыкі адной з важнейшых галін чалавечых ведаў—геалогіі **(апладысменты).** Наша краіна, якая паставіла сваёй задачай быстры ўздым матэрыяльнага дабрабыту і культурны рост усіх народаў, аб'яднаўшыхся ў Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік на аснове новага грамадскага ладу—соцыялізма—і на аснове безупыннага хуткага росту вытворчых сіл, асабліва пэніць геалогію, як навуку, якая адкрывае і ставіць на службу чалавецтву прыродныя багацці. Таму Совецкі Саюз з задавальненнем адзначае, што совецкія геолагі за 20 год існавання совецкай улады ўнеслі шмат каштоўных укладаў як у справу адкрыцця новых прыродных багаццяў, так і ў геалагічную навуку ў сябе на радзіме і за граніцай.

Совецкі Саюз высока пэніць навуковую творчасць і навуку, якія з'яўляюцца базай для ўсёй яго практычнай дзейнасці. Прадстаўнікі навукі акружаны ў Совецкім Саюзе асаблівай увагай і любоўю працоўных мас, якія аднолькава пэняць як тэорыю, што апіраецца на практыку і правяраецца ёю, так і практычную работу навуковых арганізацый, аснаваную на навуковай тэорыі.

Развіццё геалогіі ў Совецкім Саюзе дало шматлікія доказы правільнасці такіх адносін да навукі, якая квітнее ўсё пышней і ярчэй і робіцца з кожным днём неад'емным дасягненнем усё больш шырокіх мас працоўных.

Развіццё геалагічнай тэорыі дазволіла прадрачы наяўнасць магутных месцанараджэнняў усіх відаў выкапняў у новых раёнах і дазволіла з найменшымі затратамі весні пошукавыя разведкі ва ўказаных геолагамі абласцях. Іменна такім чынам у самыя апошнія гады былі адкрыты велізарныя нафтавыя багацці ў сярэднім пячэнні Волгі, паміж ракой Волгай і ракой Урал, багатыя калійныя месцанараджэнні Урала, Тунгуская вугляносная плошча ў 1.200 тыс. кв. клм. і многія іншыя.

Геалагічныя карты ахопліваюць звыш 8,5 міл. кв. кілометраў совецкай тэрыторыі, прычым замест белых плям дарэволюцыйных карт, прарэзаных малалікімі і рэдкімі маршрутнымі з'ёмкамі, совецкія геалагічныя карты знялі таксама такія раёны, як Арктыку і Далёкі паўночны Ўсход Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Гэта стала магчыма таму, што пабудаваны працоўнымі Совецкага Саюза пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і яе кіраўніка таварыша СТАЛІНА **(доўгія апладысменты; усе ўстаюць)** соцыялізм з уласцівым яму планамерным развіццём усёй народнай гаспадаркі ў інтарэсах працоўных, дазволіў сканцэнтраваць на вывучэнні прыродных багаццяў і развіцці геалагічнай навукі велізарныя сілы і сродкі і згуртаваць вакол гэтай справы ўвесь вылатны калектыў совецкіх геолагаў, кіруемых радам выдатнейшых вучоных.

Уздым і росквіт совецкай геалагічнай навукі выклікае асаблівую цікавасць з боку народаў Совецкага Саюза да Міжнароднага геалагічнага кангрэса, як да сродку шырокага абмену вопытам у галіне геалагічнай тэорыі і практыкі паміж знаўцамі геалогіі ўсіх краін.

Урад Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік з асаблівым задавальненнем вітае гэты Міжнародны геалагічны кангрэс, які сведчыць аб яднанні ўсіх вучоных розных краін у справе ўздыму навукі на новую вышыню ў агульных інтарэсах народаў усяго свету.

Мы вёрда ўпэўнены, што работы кангрэса дадуць высокаканштоўныя рэзультаты для ўсіх яго ўдзельнікаў і дапамогуць далейшаму росквіту геалагічнай навукі і ўздыму вытворчых сіл на карысць усяго чалавецтва. **(Доўгія апладысменты).**

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

Згодна зводкі іспанскага міністэрства абароны, апублікаванай 20 ліпеня, мяцежнікі 19 ліпеня прадпрынялі новыя спробы пранікнуць у размяшчэнне рэспубліканскіх войск. Аднак, гэтыя спробы былі адбіты, і рэспубліканскія пазіцыі цалкам захаваны.

Па паведамленню мадрыдскага карэспандэнта агенцтва Рэйтэр ад 20 ліпеня, контратака мяцежнікаў у сектары на ўсход ад ракі Гвадарамы прадаўжалася на працягу ўсяго дня 19 ліпеня. Сканцэнтразаўшы многа артылерыі і авіяцыі, мяцежнікі праводзілі лютую бамбардыроўку рэспубліканскіх пазіцый. Па паведамленню агенцтва Эспань, не глядзячы на лютасць атак мяцежнікаў, рэспубліканскія войскі захавалі ўсе свае пазіцыі. Страты мяцежнікаў у рэзультаце баёў, якія адбываліся 19 ліпеня, вялікія.

Мадрыдскі карэспандэнт агенцтва Брытыш Юнайтэд Прэс паведамляе, што мяцежнікі перакінулі на мадрыдскі фронт войскі з Арагоніі, з паўночнага фронта, у тым ліку і з Галісіі. Маракапскія войскі выкарыстоўваюцца мяцежнікамі разам з італьянскай пяхотай і германскай артылерыяй. На фронце ў 16 кілометраў, дзе зараз адбываюцца баі, мяцежнікі сканцэнтравалі вялікія сілы.

ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ

Згодна паведамлення іспанскага міністэрства абароны ад 20 ліпеня, на сантандэрскім участку паўночнага фронта атнём рэспубліканскай артылерыі разбураны ўмацаванні мяцежнікаў у раёне Сан-Мігуэля.

На іншых франтах становішча без змен.

ЦЫНІЧНАЕ ПРЫЗНАННЕ ІТАЛЬЯНСКАЙ ГАЗЕТЫ

РЫМ (сталіца Італіі), 20 ліпеня. (БЕЛТА). Газета «Кор'ерэ дэла Сэра» змяшчае серыю карэспандэнцый, у якіх адкрыта паведамляе аб дзеяннях італьянскай авіяцыі ў Іспаніі. На гэты раз гутарка ідзе аб аперацыях самалётаў, якія належаць да авіяцыйнай базы, пабудаванай італьянцамі на Балеарскіх астравах. Забыўшыся аб шматразовых афіцыяльных абвяржэннях вестак аб гаспадарнічанні італьянскіх войск на Балеарскіх астравах, «Кор'ерэ дэла Сэра» называе цяпер дзесяткі прозвішчаў італьянскіх афіцэраў, гаворыць аб бамбардыроўцы Каталонскага ўзбярэжжа, Валенсіі і іспанскіх чыгунак, а таксама аб нападзе італьянскіх самалётаў на іспанскія і іншыя судны. Адной з задач авіяцыйнай базы на Балеарскіх астравах,—піша газета,—з'яўляецца «кантроль над морскім ганлем». Сустрэўшы ў моры ганлёвае судно, самалёты прымушаюць яго ісці ў Маёрку ці насустрач морскім патрулям мяцежнікаў. Цікава адзначыць, што, па прызнанню «Кор'ерэ дэла Сэра», бамбардыроўку Портбу (упоблізу французскай граніцы) зрабілі іменна італьянскія самалёты. 10 мая яны скінулі на Портбу 36 бомб, 22 мая—24 бомбы.

МІТЫНГ САЛІДАРНАСЦІ З ІСПАНІЯЙ У НЬЮ-ЕРКУ

НЬЮ-ЁРК (буйнейшы цэнтр ЗША), 20 ліпеня. (БЕЛТА). Учора ў самым вялікім зале Нью-Ёрка «Мелысон сквер Гардэн» адбыўся мітынг салідарнасці з рэспубліканскай Іспаніяй з прычыны галавіны гераічнай барацьбы іспанскага народу супроць мяцежнікаў. На мітынгу прысутнічала 22 тысячы чалавек, 2 тыс. чал. размясціліся каля будынка, бо зал быў перапоўнены.

Мітынг быў арганізаваны па ініцыятыве «Паўночна-Амерыканскага камітэта дапамогі іспанскай дэмакратыі». У ліку выступаўшых былі: іспанскі паверaны ў справах, лідэр соцыялістычнай партыі Норман Томас, генеральны сакратар ЦК комуністычнай партыі ЗША Браудэр, прадстаўнікі германскіх, італьянскіх і партугальскіх антыфашысцкіх арганізацый і іншыя. Старшынёй мітынга быў О'Конэль — дэмакрат, член палаты прадстаўнікоў ад штата Мантана. На мітынгу сабрана ў карысць рэспубліканскай Іспаніі 8 тысяч даляраў і дадаткова запоўнен падпісны ліст яшчэ на 6 тысяч даляраў. Мітынг паслаў прэзідэнту Рузвельту тэлеграму пратэсту супроць так званай «палітыкі неўмяшання» ўрада ЗША.

У гэтай тэлеграме мітынг настойвае на неадкладным налажэнні эмбарго (забароны) на ваенныя матэрыялы, якія вывозяцца ў Германію, Італію і Партугалію.

ВАЕННА-ПАВЕТРАНАЕ СВЯТА Ў ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 19 ліпеня. (БЕЛТА). На аэрадроме ў Вільякубле (каля Парыжа) адбылося грандыёзнае ваенна-паветранае свята, у якім прымалі ўдзел 500 самалётаў розных тыпаў і вялікая колькасць парашутыстаў. Упершыню ў Францыі 50 салдат у поўным узбраенні спусціліся на парашутах, дэманструючы паветраны дэсант.

На святкаванні прысутнічала шмат палітычных і дзяржаўных дзеячоў. Прысутнічаў таксама паўпрэд СССР у Францыі т. Сурыц.

ПРАБЫВАННЕ СОВЕЦКІХ ЛЕТЧЫКАЎ У ЗША

ЛОС-АНЖЭЛОС (штат Каліфорнія—ЗША), 20 ліпеня. (БЕЛТА). Тт. Громаў, Юмашоў і Данілін выехалі з Лос-Анжэлоса ў Сан-Францыска на аўтамабілі.

Учора пасля наведання авіяцыйных заводаў совецкія лётчыкі адпачывалі на беразе Ціхага акіяна ў Санта-Моніка бліз Лос-Анжэлоса.

НЬЮ-ЁРК (буйнейшы цэнтр ЗША), 20 ліпеня. (БЕЛТА). Уссагульная цікавасць да пералёту «АНТ-25» і да герояў-лётчыкаў не паслабляецца. Газеты публікуюць падрабязныя паведамленні і фатаграфіі. У кінатэатрах дэманструецца хроніка: прыёмы ў гонар совецкіх лётчыкаў на аэрадроме Марчфільд, у Сан-Дыего і ў Лос-Анжэлосе.

Усе адзначаюць выключную скромнасць і дастойнства, з якім сябе трымаюць совецкія лётчыкі. Многія, бачыўшыя лётчыкаў, заяўляюць, што краіна, населеная Громавымі, Юмашовымі і Данілінымі,—непераможна. У гутарках з карэспандэнтам ТАСС многія прапоўныя падкрэсліваюць, што пералёт «АНТ-25» сведчыць аб грандыёзных поспехах соцыялістычнага будаўніцтва ў Совецкім Саюзе.

Уссагульнае захапленне і цікавасць шырокіх мас да пералёту «АНТ-25» прымушае нават самыя рэакцыйныя газеты, у тым ліку друк Хэрста, змяшчаць спрыяльныя водгукі на пералёт.

Як паведамляюць з Сан-Джасінта, усе дарогі, якія вядуць да месца пасадкі «АНТ-25», маюць надпісы: «Да совецкага самалёта».

Многія авіяцыйныя эксперты аглядалі самалёт паблізу Сан-Джасінта і з вялікай пахвалай гавораць аб канструкцыі і маторы.

ГЕРМАНСКІ ДРУК ЗАМОЎЧВАЕ ГІСТАРЫЧНЫ ПЕРАЛЁТ СОВЕЦКІХ ЛЁТЧЫКАЎ

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 20 ліпеня. (БЕЛТА). Вядомы англійскі журналіст Кэмінгс змясціў у ліберальнай газеце «Ньюс кронікл» артыкул, у якім ён палвяргае знішчаючай крытыцы замоўчванне германскім друкам гістарычнага пералёту Масква — Паўночны полюс — Паўднёвая Каліфорнія. Сотні мільёнаў людзей ва ўсіх частках свету, — піша Кэмінгс, — сачылі з незвычайнай цікавасцю за совецкім пералётам, і паспяховае завяршэнне пералёту «АНТ-25» было з захапленнем адзначана ва ўсіх краінах. За выключэннем Германіі.

Толькі германскаму народу не было дазволена ведаць што-небудзь аб совецкім пералёце. Усе радыёстанцыі Германіі, усе газеты захоўвалі поўнае маўчанне. Замежныя карэспандэнты ў Берліне, — прадаўжае Кэмінгс, — ужо перадалі ўсяму свету той факт, што германскі ўрад баіцца паведаміць германскаму народу аб выключных дасягненнях совецкіх лётчыкаў. Тым самым, — заключае Кэмінгс, — выкрыта характэрная слабасць фашысцкай дыктатуры.

НА СХОДЗЕ АКТЫВА НАРКОМЛЕСА

Прайшло пяць месяцаў пасля рашэння лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) аб сістэматычным скліканні гаспадарчымі арганізацыямі сходаў актыва. За гэты час у БССР ужо амаль-што па ўсіх наркаматах і прадпрыемствах праведзены першыя сходы. Толькі адзін Наркамат лесу па незразумелых прычынах усё адкладваў.

І вось учора нарэшце адкрыўся першы сход актыва работнікаў Наркомлеса. З дакладам аб выніках работы наркамата за першае паўгоддзе выступіў нарком тав. Рыжыкаў.

Усе ўдзельнікі схода чакалі ад наркома разгорнутай большэвіцкай крытыкі работы прадпрыемстваў, трэстаў і апарата наркамата. Аднак яны глыбока памыліліся. У сваёй паўтарагадзіннай прамове тав. Рыжыкаў пералічыў многа фактаў шкодніцкай дзейнасці ворагаў народу, якія ўжо даўно зныкрыты памма Наркомлеса.

Якія-ж практычныя вывады зрабіў для сябе Рыжыкаў у сваёй далейшай рабоце, якія меры ён прыняў для канчатковага выкрыцця і выгнання з сістэмы Наркомлеса ворагаў і для ліквідацыі вынікаў шкодніцтва? Аб гэтым ён «забыўся» сказаць сходу.

Між тым да апошняга часу тав. Рыжыкаў літаральна нічога не зрабіў па ачышчэнню трэста «Лесбел» і леспрамгасаў ад засеўшых там шкоднікаў і ворагаў. На сігналы «Звязды» аб засмечанасці апарата «Лесбела» і кіраўніцтва лесаахоўны Рыжыкаў дагэтуль не рэагуе. Больш таго, ён гэту справу даручыў для рэагавання... самому «Лесбелу».

Таз. Рыжыкаву спатрэбілася два месяцы для таго, каб прысці сёння на сход і заявіць: «Мы яшчэ не перабудаваліся».

Дакладчык бязэўба, баязліва гаварыў аб агіднай рабоце буйнейшага трэста наркамата—«Лесбела», які ўвесь час правальвае работу і не выконвае свайго плана. Ён нават не назваў ні аднаго прозвішча з кіраўнікоў прадпрыемстваў і леспрамгасаў, якія злачынна зрываюць работу па выкананню важнейшага дзяржаўнага задання. Ці зыпадкова, што тав. Рыжыкаў ні слова не сказаў аб апараце самога наркамата, які не менш засмечан класава-варожымі элементамі?

Даклад наркома не мабілізаваў удзельнікаў схода на большэвіцкае разгортванне крытыкі і выяўленне недахопаў у рабоце Наркомлеса. Гэта пацвярджаюць першыя выступленні ў спрэчках. Рад прамоўцаў (Лебедзеў, Афанасьеў, Гіппер) займаюцца дэмагогіяй, агульнымі разважаннямі.

І. Т.

М. К. Громаў, Л. І. Громава і Б. Расінскі —

таварышу СТАЛІНУ

Дарагі і любімы Іосіф Вісарыёнавіч!

Герой Совецкага Саюза М. М. Громаў бліскуча выканаў Ваша заданне. Мы, бацькі і настаўнік лётнай справы М. М. Громава, шчаслівы ад усведамлення, што, дзякуючы Вашаму мудраму выхаванню і чулым адносінам да чалавека, блізкі нам М. М. Громаў мог з гонарам выканаць такое пачэснае сталінскае заданне.

Вашы клопаты аб людзях і, асабліва, аб лётчыках, натхняюць іх на новыя подвігі і даюць ім магчымасць выканаць тое, што да гэтага часу чалавецтву здавалася немагчымым.

Шчаслівыя і гордыя подвігам М. М. Громава, мы дзякуем Вам, натхніцелю цэлага раду подвігаў, якімі ганарыцца і славіцца наша соцыялістычная радзіма.

Шчасце быць бацькамі такога сына і настаўнікам такога вучня.

Бацька — урач М. К. ГРОМАЎ.
Маці—Л. І. ГРОМАВА.

Настаўнік—заслужаны лётчык СССР—ордэнаносец Б. РАСІНСКІ.

Масква, 19 ліпеня 1937 г.

Скасаванне інструкцыі па ўнутрыкалгаснаму землеўпарадкаванню

17 студзеня гэтага года былым намеснікам наркома земляробства СССР была зацверджана інструкцыя па ўнутрыкалгаснаму землеўпарадкаванню. У сувязі з тым, што яна мела рад няправільных палажэнняў, а таксама ў сувязі з выясненнем пытання аб увядзенні правільных севазваротаў на абмеркаванне ў друку, нарком земляробства Саюза ССР тав. М. А. Чэрноў скасаваў гэту інструкцыю. (БЕЛТА).

АД КАМІТЭТА ЎСЕСАЮЗНАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ВЫСТАЎКІ

Праверкай, праведзенай у раёнах масавай уборкі, устаноўлена, што рад калгасаў, якія маюць па сваёй уражайнасці права падачы заяў аб удзеле на Ўсесаюзнай Сельскагаспадарчай выстаўцы, не адбіраюць натуральных экспанатаў.

Калгасы і саўгасы, якія не будуць мець сваіх натуральных экспанатаў адабраных з ураджаю 1937 года, не могуць належным чынам арганізаваць паказ сваіх дасягненняў на Ўсесаюзнай Сельскагаспадарчай выстаўцы.

Зямельныя органы і выставачныя камітэты абавязаны давесці да ведама кожнага калгаса і саўгаса, перадавіка і арганізатара сельскай гаспадаркі парадак адбору і хавання натуральных экспанатаў для Ўсесаюзнай Сельскагаспадарчай Выстаўкі.

Старшыня Камітэта Ўсесаюзнай Сельскагаспадарчай Выстаўкі народны камісар земляробства Саюза ССР М. А. ЧЭРНОЎ.

НЕ ПАЎТАРАЦЬ ПАМЫЛАК СЛУЦКА І МОЗЫРА

Ва ўсіх раёнах рэспублікі, за малым выключэннем, разгарнулася масавая ўборка азімых і ранніх пасеваў яравых культур. На 15 ліпеня па рэспубліцы зжата 9,5 проц. зернавых. Некаторыя паўднёвыя раёны (Камарынскі, Нараўлянскі, Даманавіцкі) убралі ад 45 да 50 проц. зернавых. Дзесяткі калгасаў ужо скончылі ўборку жыта, а некаторыя з іх поўнасцю разлічыліся з дзяржавай па абавязковых збожжапастаўках (калгас «Прагрэс», Лельчыцкага раёна і інш.).

Аднак, выспяванне зернавых і ільну паўсямесна, і тым больш у паўднёвых раёнах, патрабуе ўзмацнення тэмпаў уборкі. У сваёй пастанове, апублікаванай 20 ліпеня, аб ходзе ўборкі ўраджаю па Слуцкай і Мазырскай акрутах СНК БССР і ЦК КП(б)Б указалі на «зусім марудныя тэмпы ўборкі зернавых і ільну ў раёнах гэтых округ. Уборачныя машыны — камбайны, жняяркі, ільнаперабілкі, малатарні і інш. скарыстоўваюцца дрэнна. Няма належнай барацьбы за выкананне норм выпрацоўкі як на машынах, так і на ручной уборцы. Да гэтага часу, не гледзячы на папярэджанне ЦК і СНК, няма таксама належнай барацьбы за захаванне ўраджаю ад страт, адсутнічае ахова ўраджаю ад раскрадвання і пажару. Паміж жнівом, возкай, абмалотам і здачай дзяржаве зярна існуе недапушчальны разрыў».

Разам з тым, СНК БССР і ЦК КП(б)Б папярэдзілі ўсе астатнія раёны аб неабходнасці ўлічыць памылкі, якія дапускаюцца ў Слуцкай і Мазырскай акругах, і не паўтараць іх.

Цяпер-жа трэба прыняць меры, каб не дапусціць малейшага перастою хлябоў і ільну, бо гэта пагражае вялікімі стратамі. У гэтай справе безумоўна рашаючую ролю павінны адыграць сельгасмашыны на ўборцы. Аднак, сігналы сведчаць, што многія раёны і МТС паўтараюць памылкі Слуцкай і Мазырскай округ. Сельгасмашыны на ўборцы дрэнна скарыстоўваюцца. Напрыклад, ў Жлобінскім раёне з-за несвоечасовай адвозкі ад камбайнаў зярна, незабеспячэння камбайнаў неабходнай абслугоўваючай рабочай сілай апошнія даюць недапушчальна нізкую выпрацоўку. Так, у калгасе «На варце» за тры дні работы камбайн убраў усяго 3 гектары.

Прастойваюць камбайны і ў Грэскім раёне, не ўключыліся як след у работу і ў Менскім, Круглянскім і ў некаторых іншых раёнах. У Старобінскім раёне большасць уборачных машын прастоўвае, не выкарыстоўваецца на ўборцы з прычыны шкодніцтва, якое дапушчана пры рамонце.

Унушае трывогу ігнаравание ў многіх раёнах якасці ўборкі. Яшчэ і да гэтага часу, не гледзячы на сігналы, не прыняты меры, каб забяспечыць усе жняяркі зернаўлазіцелямі, арганізаваць усюды на палях збор каласоў.

Бесклапотнасць, якая праяўляецца многімі кіраўнікамі калгасаў, соўгасаў і зямельных органаў да якасці ўборкі, нярэдка скарыстоўваецца шкоднікамі. Яркім прыкладам гэтага можа служыць факт, які гэтымі днямі меў месца ў адным з буйнейшых калгасаў Менскага раёна — імя Фалько. Тут на 8 гектарах убранага жняяркай жыта дапушчана да 30 пропантаў страт. Старшыня гэтага калгаса Ерашэвіч аднёсся да гэтага, як да звычайнай з'явы.

Буйнейшыя скажэнні дапускаюцца ў арганізацыі працы на ўборцы. Не ўсюды ўведзена здзельшчына. Такія факты маем і ў Даманазіцкім і Чэрыкаўскім раёнах.

Выключна важнай справай з'яўляецца арганізацыя палітычна-масавай работы ў брыгадзе, у звяне, на полі. Між тым сігналы, якія паступаюць з большасці раёнаў, гавораць, што гэтай справе партыйныя арганізацыі не надалі належнай увагі. У прамую сувязь з гэтай з'явай трэба ставіць факты слабага разгортвання сацыялістычнага спаборніцтва і стаханаўскага руху ў многіх калгасах і соўгасах. Вопыт стаханаўцаў на ўборцы слаба папыраецца.

Усе гэтыя недахопы трэба найхутчэй зжыць. Ад гэтага будзе залежаць поспех правядзення далейшых работ па ўборцы ўраджаю, будзе залежаць узорнае выкананне абавязкаў перад дзяржавай.



У калгасе «Чырвоны партызан» Бярозаўскага сельсовета, Мазырскага раёна, разгарнулася ўборка ўраджаю. НА ЗДЫМКУ—камбайн на палях калгаса «Чырвоны партызан». Кіруе камбайнам маладая камбайнерка Цэлеш Маня і механік камбайнер тав. Жогла. Фото І. Пікмана (БСФ).

АБМЯРКОЎВАЕМ ПЫТАННІ ПАЛЯПШЭННЯ СЕВАЗВАРОТАЎ

НЕКАТОРЫЯ ЗАЎВАГІ АБ СЕВАЗВАРОТАХ

Апублікаваны праект камісіі Наркамзема і Наркамсоўгасаў СССР «Аб увядзенні правільных севазваротаў» мае выключна вялікае палітычнае і народна-гаспадарчае значэнне.

Асноўнае заключаецца ў тым, што справе ўвядзення севазваротаў надаецца дзяржаўнае значэнне. Толькі пры гэтых умовах распрацоўка севазваротаў будзе больш абдуманай, а стала быць, больш правільнай.

Разгляд севазваротаў на калгасным сходзе, прэзідыуме райвыканкома і канчатковае зацверджанне наркомам земляробства БССР выключае магчымасць буйных памылак і затрымліць работу класавых ворагаў і шкоднікаў.

Для хутчэйшага ўвядзення севазваротаў у БССР зараз неабходна ўсім зямельным органам — Наркамзему, райземаддзелам, машынна-трактарным станцыям пераглядзець суадносіны культур з тым, каб ужо з восені 1937 года (сяўба азімых) намеціць рашучыя змены ў старану набліжэння суадносін культур да севазваротаў, якія будуць уводзіцца ў калгасах раёна. Гэта ў значнай ступені аблегчыць справу ўвядзення севазваротаў і — галоўнае — паскорыць на год-два пераход да правільнага севазвароту. Гэта будзе першы крок у справе ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў сельскай гаспадарцы БССР і важнейшым этапам у справе ўвядзення правільных севазваротаў.

У сувязі з тым, што сяўба шматгадовых траў, пачынаючы ўжо з 1938 года, павінна быць павялічана ў некалькі раз, узнікае другая, не менш важная задача — гэта поўнае захаванне насенных участкаў канюшыны, узорнае правядзенне выпірання канюшыны і захавання насення. Зямельныя органы зараз-жа павінны пакланяціца аб павелічэнні колькасці насення канюшыны ў кожным раёне БССР для падсеву яе ў будучым годзе.

Увядзенне новых севазваротаў прымушае нас ужо зараз грунтоўна прадумаць па кожнаму калгасу пытанне будучага развіцця садоў і гародаў. Плошча, якая зараз занята пад садамі і гародамі, а таксама тая плошча, якая на працягу трэцяй пяцігодкі будзе займацца садамі, павінна быць выключана з севазваротнай плошчы. БССР мае ўсе ўмовы для шырокага развіцця таварнага садоўніцтва, і таму рэзерваванне плошчы пад будучую пасадку садоў набывае ўжо зараз вялікае значэнне.

Мы не згодны з адным пунктам праекта, дзе гаворыцца, што «ў калгасах нячорназемнай паласы, не сеючых лён, увесці ўзамен аднаго з папаравых палёў пэлае поле канюшыны з цімафееўкай з аднагадовым іх скарыстаннем». У БССР рад раёнаў (Менскі, Гомельскі і інш.) вельмі мала сеюць лёну, аднак калгасы ў гэтых раёнах вельмі насычаны жывёлай. Пры адсутнасці кармовай базы ў выглядзе натуральных сенажаняў і выпасаў было-б неразумным пазбаўляць калгасы такіх раёнаў севазваротаў з двума канюшыннымі палямі. Мы лічым, што на ўсіх звазных глебах у калгасах БССР, за выключэннем калгасаў, якія ў дастатковай ступені забяспечаны сенажацямі і выпасамі, уводзіць, як правіла, севазвароты з двума гадамі карыстання канюшынай.

У паспяховым правядзенні работы па ўвядзенню новых севазваротаў рашаючую ролю будуць адыгрываць кадры. З гэтага пункту погляду Наркамзему БССР неабходна неадкладна пачаць работу па падрыхтоўцы аграномаў і землеўпарадчыкаў і сабраць кадры землеўпарадчыкаў, якія перайшлі на іншыя работы і зараз працуюць не па спецыяльнасці.

Нам думаецца, што праект трэба дапоўніць пунктам аб прэміраванні аграномаў і землеўпарадчыкаў за кожны распрацаваны імі і зацверджаны севазварот, прыблізна, па 50—100 рублёў. Гэта будзе вялікім стымулам для лепшага і паспяховага ажыццяўлення задачы ўвядзення правільных севазваротаў у калгасах БССР.

А. М. СЯРМЯЖКА.
Аграном Менскага райза.

НАШЫ ПРАПАНОВЫ

Праект Камісіі Наркамзема СССР і Народнага камісарыята зернавых і жывёлагадоўчых соўгасаў Саюза ССР аб увядзенні правільных севазваротаў своечасова пастаўлен на абмеркаванне шырокіх мас. Калі да гэтага часу не было парадку ў скарыстанні ворыўных плошчаў, то зараз ён будзе наведзен.

Камісія ў праекце гаворыць аб пашырэнні сяўбы траў з 4,8 мільёнаў гектараў да 20—22 мільёнаў, пры поўным асваенні севазвароту. Увядзенне травапольных севазваротаў рэзка павялічыць ўраджайнасць нашых соцыялістычных палёў.

Зусім правільна пастаўлена пытанне аб пашырэнні плошчы раллі шляхам асваення новых зямель. Гэта мерапрыемства магчымае і неабходнае.

У праекце гаворыцца, што ў калгасах нячорназемнай паласы, якія не сеюць ільну, увесці ўзамен аднаго з папарных палёў палае поле канюшыны з цімафееўкай з аднагадовым іх скарыстаннем.

Так, увесці поле канюшыны будзе добра, але толькі без цімафееўкі, таму што цімафееўка пры аднагадовым скарыстанні не дасць эфекту, і мы павінны яе заараць зусім неразвітую. Затрата насення цімафееўкі не апраўдае назначэння яе ў пасевах канюшыны, тым больш, што такія севазвароты будуць уводзіцца на менш звязных глебах.

У схемах севазваротаў адначасна з павелічэннем пасеву траў, асабліва шматгадовых, неабходна прадугледзець пакіданне чыстых і лубінавых папараў не менш чым 10—12 проц., а ў асобных выпадках — і 15 проц.

Тэрміны ўвядзення севазваротаў можна скараціць. Для гэтага трэба зараз у раёнах пачаць спецыяльныя 3—6-месячныя курсы агратэхнікаў і тэхнікаў-землеўпарадчыкаў. Кадры, падрыхтаваныя на мясцах, змаглі-б скараціць на год тэрмін увядзення севазваротаў у калгасах.

Аграномы халопеніцкага райземаддзела
ПРЫШЧЭПЧЫК, КАНДРАТОВІЧ, САВІНІЧ.

ЦІ ТОЛЬКІ БЯСКЛОПАТНАСЦЬ?

Кіраўнікі Белкаапромсовета да самага апошняга часу ўпарта сцвярджалі, што ў прамысловай кааперацыі шкодніцтва не можа быць, бо ў іх-жа няма буйных прадпрыемстваў і высокааспашчонай вытворчасці, а ў невялічкіх арцелях шкоднікам, маў, няма чаго рабіць. Гэтая антыпартыйная шкодная ўстаноўка была накіравана на тое, каб усыпляць пільнасць членаў арцелі, утойваць ад іх сапраўднае становішча.

У гэты-ж час у сістэму прамысловай кааперацыі пры патуранні яе кіраўнікоў прабіраліся на кіруючую работу ў якасці членаў арцелей ворагі народу—трацкісты, шпіёны, злачынцы, жулікі і спекулянты, выкрытыя і выгнаныя з іншых прадпрыемстваў і ўстаноў. Тут іх свабодна прытулілі, высоўвалі на адказныя пасады, ствавалі ўмовы для іх шкодніцкай варожай дзейнасці.

Прэзідыум Белкаапромсовета на чале з тав. Катаводавым меў нямала сігналаў аб шкодніцкай рабоце старшыні аршанскай вяровачнай арцелі «Дняпро» Будніцкага. Гэты прахадзімец раскрадваў кааператыўную маемасць, свядома заблытаў сістэму ўліку. За свае злачынныя справы ён два разы аддаваўся суду. Але-ж яго лічылі ўвесь час незамянімым спецыялістам.

Карыстаючыся давер'ем начальства, Будніцкі вербаваў у арцель цёмных элементаў і злачынцаў. У завяршэнне яны спалілі новапабудаваны часальны цэх. Страты складаюць каля 250 тысяч рублёў.

Гомельскі швейпромсаюз узначальваў вораг народу трацкіст Лейбовіч. Усімі мерамі ён стараўся амерцвяць сродкі, адпушчаныя на капітальнае будаўніцтва. Па яго дырэктыве былі закуплены на 300 тысяч рублёў адыходы аўтакамер на выпрацоўку нітак і гумавага клею, у той час, калі завод і склады яшчэ не былі пабудаваны. Увесь гэты матэрыял ляжыць пад адкрытым небам і гніе. Абаротныя-ж сродкі растрачаны, а арцелі сядзяць зараз без сыравіны.

Арцеллю «Пабеда» (Менск) кіраваў трацкіст Тумін. Пры яго «гаспадаранні» арцель мела 81 тыс. рублёў страт. У арцелі няма ніякага кантролю і ўліку. У выпускаемых булках знаходзілі цвікі і кавалкі шкла.

За 1936 год і першы квартал гэтага года ў арцелях здарылася 17 пажараў, якія прынеслі па сотні тысяч рублёў страт.

Хіба ўсе гэтыя факты шкодніцтва з'яўляюцца выпадковымі?

Нават пасля выкрыцця органамі НКВД у самім апараце совета і ў арцелях групы трацкістаў (Голубева, Фіалко, Фрыман, Тумін, Лейбовіч, Васкабойнікава і інш.), прэзідыум Белкаапромсовета абсалютна ніякіх мер не прымае для выкарчоўвання рэштаў шкодніцтва і выкрыцця ворагаў народу, якія яшчэ да гэтага часу арудуюць у сістэме промкааперацыі.

У менскай арцелі «Чырвоны друкар» сабралася група былых ўладарнікаў друкарань і буйных гандляроў (Загер, Зысман, Бубінзэр, Фрыман, Кунер, Бернштэйн, Каробачкін, Саламоннік і інш.). Для «ўмацавання» гэтай арцелі быў прыслан у свой час двурушнікам Халасевічам выкрыты трацкіст Пеўзнер, які зараз узначальвае ўсю гэту шайку.

Старшым наборшчыкам з'яўляецца Юршчык — былы ўладар друкарні. Да рэволюцыі ён друкаваў лістоўкі чорнасоценцаў. Намеснікам старшыні арцелі тут выбран былы ўладар друкарні Каробачкін.

Гэта кампанія зрывае стаханаўскі рух і выкананне норм, устаноўленых галіннай канферэнцыяй. У заказчыкаў яна бяре хабары і прадстаўляе ілжывыя рахункі. Тут ужываецца даўно асуджаная калектыўная здзельшчына.

Шрыфт захоўваецца неахайна і даступны кожнаму. У арцелі часта бываюць кражы шрыфта (да 300 кілограмаў). Якасць прадукцыі агідная, дысцыпліна развалена. Тут мелі месца шавіністычныя і контррэволюцыйныя выступленні. Трацкіст Пеўзнер зламаў машыну «Амерыканку», але-ж гэты факт замазалі.

Старшыня арцелі комуніст Дарасінскі разам з гэтай кампаніяй прымае ўдзел ва ўсіх цёмных дзялішках.

Аб справах у арцелі «Чырвоны друкар» Катаводаў меў дзесяткі сігналаў, але чамусьці на іх не рэагуе. Арцель, якая павінна быць асабліва ўзмоцнена палітычна-правераными людзьмі, аказалася ў руках класава-чужых элементаў.

Пачынаючы з 1932 года, адзін з буйнейшых саюзаў промкааперацыі — Белкерамбудсаюз не выходзіць з прарыву, арцелі не выконваюць сваіх планаў. Прэзідыум Белкаапромсовета нібы гэтага не прыкмячаў і лічыў гэта нармальнай з'явай,—маў, новая справа, і адразу нельга асвоіць.

Але варта толькі бліжэй азнаёміцца з арцелямі, як прычыны прарыву даволі ярка высвятляюцца. Улічваючы важнасць гэтага ўчастка, ворагі сюды асабліва накіроўвалі сваю ўвагу.

Па рэкамендацыі адзела кадраў Белкаапромсовета (начальнік Сіндэр) Керажсаюз назначае старшынёй лялскай арцелі трацкіста Жыткоўскага, які правальвае работу.

У аршанскай арцелі «Тружанік» начальнікам цэха працуе нейкі Куксевіч, які быў асуджан як агент польскай аховранкі. Цэх не выконвае ўвесь час свой план. Прэс працуе з перабоямі.

Такіх фактаў дзесяткі. Таму зусім не дзіўна, чаму Булкерамсаюз увесь час не выконвае свайго плана і за першае паўгоддзе недадаў краіне 13 мільёнаў цаглінсырпу і 8 мільёнаў абпалу.

У выніку велізарных раскрадванняў у 1936 годзе саюз меў 850 тысяч рублёў страт. З пачатку 1937 года былі зняты з працы і адданы пад суд 15 старшынь арцелей, якія аказаліся шкоднікамі, злачынцамі, жулікамі.

***

Прамысловая кааперацыя займае даволі значнае месца ў рэспубліцы па выпуску прадукцыі. Сёлета арцелі Белкаапромсовета павінны даць на 337 мільёнаў рублёў тавараў. Вынікі першага паўгоддзя сцвярджаюць, што промкааперацыя не перабудавала сваёй работы ў адпаведнасці з рашэннямі партыі і ўрада.

Промкааперацыя не выконвае ні аднаго з асноўных заданняў урада па выпуску тавараў шырспажыву, дзіцячага асартыменту і рамонту. У 1936 годзе Белкаапромсовет не давёў да сістэмы план вытворчасці прадметаў шырспажыву. Соўнарком БССР папярэдзіў тав. Катаводава, што калі не будзе пералому ў гэтым, ён будзе прыцягнут да суровай адказнасці.

Восем месяцаў прайшло пасля таго. Факты паказваюць, што тав. Катаводаў ніякага пералому не дабіўся. План па рамонту абутку выканан за першае паўгоддзе на 54,9 проц., па швейнай групе — на 24,4 проц., па трыкатажнай — 26,3 проц.

Такое-ж становішча і з вырабам дзіцячага асартыменту. Вытворчы план па абутку выканан на 63,3 проц., па дзіцячых польтах — 22,4 проц., касцюмах — 14,3 проц.

Поўгаданы план па шырспажыву выканан на 85 проц. Краіна недаатрымала на 24 мільёны рублёў рознастайных прадметаў шырспажыву. Прычым, трэба адзначыць, што якасць выпускаемай прадукцыі вельмі дрэнная. Многія арцелі абсалютна не лічацца са спажыўцамі і называюць вынак бракам і ўсякім хламам.

У большасці сваёй усе пытанні вырашаюцца ў Белкаапромсовеце апытаннем, пры адсутнасці большасці членаў прэзідыума. З 1932 года ўсе органы кіравання не перавыбіраліся. У сістэме промкааперацыі шырока практыкуецца назначэнства і перамяшчэнне старшынь саюзаў і арцелей без згоды членаў арцелі. Прыняцце на работу і выключэнне з арцелі праводзіцца таксама без ведама членаў арцелі.

Рашэнне Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) аб сістэматычным скліканні шырокіх сходаў актыва Катаводавым свядома не выконваецца.

— У нас кааператыўная форма кіравання, і таму сходы актыва непатрэбна склікаць, — гаворыць Катаводаў. Катаводаў стараецца ўтаіць ад шырокай масы членаў арцелей сапраўднае становішча прамысловай кааперацыі, дзе ворагам народу дадзена поўная свабода для іх падрыўной дзейнасці.

І. ТУРЭЦКІ.

ВЫБАРЧЫ ЗАКОН КРАІНЫ СОЦЫЯЛІЗМА І ВЫБАРЧЫЯ ПАРАДКІ У ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ

А. САКАЛОЎСКІ

4 Сесія ЦВК СССР зацвердзіла «Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет». Вялікія прынцыпы совецкага выбарчага права, абвешчаныя Сталінскай Канстытуцыяй, уваплашчаны ў жыццё. Краіна соцыялізма мае самы дэмакратычны ў свеце выбарчы закон.

У буржуазных канстытуцыях запісана нямала прыгожых слоў аб свабодзе, але гэтыя свабоды існуюць толькі для буржуазіі, а на долю рабочага і селяніна астаецца бяспраўе, вяроўка — права на галоднае нявольніцкае існаванне.

Па справядлівай заўвазе Карла Маркса, у буржуазных канстытуцыях «кожны параграф мае ў сабе сваю ўласную прапілегласць — свабоду—у агульнай фразе, скасаванне свабоды—у агаворцы».

Польская буржуазія ніколі не ўводзіла дэмакратычных свабод, нават у тым аб'ёме, які існуе ў іншых буржуазных краінах.

У 1919 годзе пад націскам масавага руху пролетарыята таго часу ўрад «соцыяліста» Марачэўскага выдаў закон аб выбарах ва ўстаноўчы сход на аснове прамога, усеагульнага, тайнага, роўнага і прапарцыянальнага выбарчага права. Гэты выбарчы закон быў прынят у сакавіку 1921 года, калі ўводзілася так званая сакавіцкая канстытуцыя.

Але з першых дзён узнікнення польскай буржуазнай дзяржавы штых і бізун заўсёды былі непублічнай асновай усіх гэтых дэмакратычных дэкларацый. З самага пачатку свайго прабывання ва ўладзе польская буржуазія люта праследвала комуністычную партыю і рэволюцыйныя арганізацыі працоўных. Закон аб 8-гадзінным рабочым дні аб ахове працы быў хутка абмяжован радам дадатковых дэкратаў. Аграрная рэформа, абяцаная сялянам у 1919-20 г., была праведзена ў інтарэсах памешчыкаў і кулакоў. Нацыянальнае прыгнечанне Заходняй Беларусі і Украіны было ўзаконена самой сакавіцкай канстытуцыяй.

У 1935 годзе буржуазія ўвяла новую канстытуцыю. Новы выбарчы закон скасаваў усеагульнае, прамое, тайнае, роўнае і прапарцыянальнае выбарчае права, фармальна яшчэ існаваўшае, а на справе ўжо даўно падмененае выбарчым машэнніцтвам і гвалтам.

Наша Сталінская Канстытуцыя і выцякаючы з яе выбарчы закон гарантуюць сапраўды ўсеагульнае, прамое і роўнае выбарчае права пры тайным галасаванні, права, якога няма ні ў адной капіталістычнай і тым больш у фашысцкай краіне.

У Польшчы існуе цэнз аседласці да 1 года. Гэтым самым пазбаўляецца выбарчых праў шматлікая маса беспрапоўных і сезоннікаў, якія ў пошуках працы вымушаны часта мяняць сваё месцажыхарства. Павышан і ўзрасны цэнз — з 21 да 24 год. Права быць выбраным прадстаўляецца толькі маючым 30-гадовы ўзрост. Такім чынам, пазбаўляецца выбарчых праў некалькі мільёнаў самай актыўнай часткі насельніцтва—моладзі. 10 параграфаў трэцяга артыкула польскага выбарчага закона пералічваюць мноства катэгорый асоб, якія пазбаўляюцца выбарчых праў. Сярод іх—асобы, пазбаўленыя выбарчых праў «з прычыны адсутнасці ў іх ластатковых маральных ці разумовых якасцей», алхіленыя ад дзяржаўнай і ваеннай службы па матывах неблагаднадзейнасці, асобы, якія не маюць бацькоўскага апякунства, змешчаныя судом у бальнічныя ўстановы і многія іншыя. Не цяжка здагадацца, што, па ўяўленню польскіх фашыстаў, асобамі, якія «не маюць маральных ці разумовых якасцей», «неблаганадзейнымі» і «немаючымі апякунства», з'яўляюцца іменна рабочыя і сяляне.

Артыкулы 56 і 57 сталінскага выбарчага закона гаворыць аб праве выстаўлення кандыдатаў у Вярхоўны Совет. Гэта права маюць партыйныя арганізацыі, прафсаюзы, кааперацыя, арганізацыі моладзі, культурныя таварыствы і іншыя арганізацыі, зарэгістраваныя ва ўстаноўленым законным парадку. Выстаўляць кандыдатаў у Вярхоўны Совет маюць права агульныя сходы рабочых і служачых, сялян і чырвонаармейцаў. Кожны грамадзянін нашай радзімы мае магчымасць актыўна ўдзельнічаць у выстаўленні таго ці іншага кандыдата ў Вярхоўны Совет.

Нічога падобнага не можа быць і няма пры выбарах у буржуазныя парламенты. У Польшчы па выбарчаму закону 1935 года права вылучэння кандыдатаў прадстаўляецца выключна выбарчым калегіям. Гэтыя калегіі складаюцца з прадстаўнікоў гандлёва-прамысловых палат, аб'яднанняў памешчыкаў і кулакоў, гарадскога і тэрытарыяльнага самакіраўніцтва.

Польскія паны пры ўвядзенні свайго выбарчага закона прабавалі захаваць відзімасць «дэмакратыі». Яны прадаставілі прафсаюзам «права» пасылаць у акруговыя выбарчыя калегіі сваіх прадстаўнікоў. Але каб рабочыя не выкарысталі гэтай шчыліны ў фашысцкім законе, ідзе агаворка, што такім правам могуць карыстацца толькі тыя прафсаюзы, якія на працягу трох год не закрываліся ўладамі. Нават некаторыя фашысцкія газеты вымушаны былі прызнаць, што ў Польшчы няма такога прафсаюза, які-б на працягу такога часу не падвяргаўся рэпрэсіям. Выбарчы закон прадугледжвае, што 500 чалавек насельніцтва таксама «могуць» паслаць свайго прадстаўніка ў акруговую калегію. Але гэтае «права» абстаўлена такімі ўмовамі, якія ў краіне фашызма ажыццявіць немагчыма: трэба сабраць 500 подпісаў, подпіс кожнага засведчыць у натарыуса; засведчанне-ж подпісаў каштуе 1 злоты, прычым у гэтым засведчанні подпісу па розных матывах наогул могуць адмовіць.

Створаныя такім паралкам акруговыя выбарчыя калегіі з урадавым камісарам на чале ў кожнай акрузе вылучаюць чатырох кандыдатаў, прадстаўляючы выбаршчыку права выбіраць двух з іх. Атрымаўшы права такога «выбару», народныя масы Польшчы палічылі за лепшае не з'яўляцца да выбарчых урн, а ў многіх мясцах выходзілі на вуліцу і патрабавалі адмены выбарчага закона, які яўна здзекваецца з прапоўных і дэмакратыі.

Наш совецкі выбарчы закон зыходзіць з роўнапраўя ўсіх нацый і рас. Выбарчы закон ідзе насустрач насельніцтву адданых і малалікіх раёнаў, выбаршчыкам, якія знаходзяцца ў санаторыях, радзільных дамах, дамах інвалідаў плаваючых суднах, і прадугледжвае стварэнне там самастойных выбарчых участкаў.

У Польшчы 40 проц. усяго насельніцтва складаюць прыгнечаныя народы—беларусы, украінцы, яўрэі і інш., супроць якіх накіраваны шматлікія артыкулы законаў. У 1935 годзе колькасць выбарчых округ у Польшчы зменшылася з 208 да 104. Змяншэнне округ праведзена так, што на аднаго дэпутата ў Заходняй Беларусі і Украіны прыпадае значна больш насельніцтва, чым у Польшчы.

Вядома, што ўсякіх выбары ў фашысцкай Польшчы суправаджаюцца «цудамі» ў выбарчых урнах. Асабліва вялікія «цуды» фальсіфікацыі і ашуканства адбываюцца ў Заходняй Беларусі. У Палескім ваяводстве на 356 тысяч выбаршчыкаў аказалася пасля трохзённага «падліку» 425 тысяч паданых галасоў. У выніку гэтага наглага мацэнніцтва, непісьменныя палескія сяляне аказаліся куды больш «актыўнымі», чым жыхары Варшавы, дзе прымала ўдзел у галасаванні 22 проц., або Лодзі, дзе галасавала ўсяго толькі 13 проц. У свой час у апазіцыйным друку было многа фактаў, як паліцэйскія гналі сялян у памяшканне выбарчых участкаў, давалі ім на рукі па некалькі загадзя падрыхтаваных канвертаў з бюлетэнямі і прымушалі кідаць іх у выбарчыя ўрны. Уся «свабода» пералвыбарчай агітацыі заключалася ў тым, што прадстаўнікі ўрадавага апарата раз'язджалі па мястэчках і вёсках і пагражалі штрафамі тым, хто не пойдзе галасаваць за фашыстаў.

Вядома, што шырокія масы Польшчы байкатавалі гэтыя выбары. Больш 70 проц. насельніцтва Польшчы ў выбарах не прымала ўдзелу. У абставінах тэрору і ашуканства толькі 28 проц. галасавала за фашысцкіх кандыдатаў. Тым не менш выбары былі прызнаны сапраўднымі, а сейму прадастаўлена права ўзаконіць усе гвалтаванні і мацэнніцкія ўчынкі фашысцкіх улад.

Найбольш яркім выражэннем фашысцкай выбарчай сістэмы з'яўляюцца выбары ў сенат. Тут нават няма і відзімасці выбараў. Па выбарчаму закону 1935 года выбіраць у сенат можа толькі т. зв. «эліта», гэта значыць прадстаўнікі кіруючых класаў, узнагароджаныя ордэнамі, атрымаўшыя вышэйшую асвету і т. д. Але і гэта прывілеяваная кліка не сама выбірае сенатараў, яна толькі выбірае камісіі выбаршчыкаў, якія вылучаюць сенатараў. Трэцюю частку сенатараў назначае прэзідэнт.

Польская буржуазія разлічвала, што, устанаўліваючы новую канстытуцыю і новы выбарчы закон, ёй удасца кансалідаваць кіруючы фашысцкі лагер і падпарыць яго апору ў масах. Аб тым, што ім не ўдалося гэтага дасягнуць, вымушаны прызнаваць і сам фашысцкі друк. Газета «Палітыка» — орган фашысцкай моладзі, падтрымліваючай урад, у пачатку ліпеня г. г. пісала: «У Польшчы пануе маразм. Ніхто не ведае, чаго хоча, ніхто не ведае, што будзе. Рэжым? Канстытуцыя? Пяперашні сейм і сенат? Монны ўрад? Унутраная палітыка?—усё гэта пад знакам пытання».

Чым больш апасаюцца польскія фашысты за лёс сваёй канстытуцыі, за лёс буржуазнага ладу, тым больш яны паклёпнічаюць на краіну соцыялізма, на яе Сталінскую Канстытуцыю і выбарчы закон. Тав. Якаўлеў у сваім дакладзе на Сесіі ЦВК СССР указваў, як фашысцкая газета «Ілюстраваны кур'ер подзенны» прабавала пераканаць сваіх чытачоў, што праект нашага выбарчага закона быццам дае ўрадавай камісіі «права змяняць кандыдацкія спіскі арганізацыі». Шляхам паклёпу фашысты стараюцца не дапусціць, каб Сталінская Канстытуцыя і выбарчы закон сталі вядомымі шырокім масам.

Аб тым, што прапоўныя масы не вераць хлусні фашысцкіх газет, можна пераканацца на іх адносінах да польскай канстытуцыі і выбарчага закону. Па даных польскіх газет, каля 200 тыс. польскіх сялян у красавіку 1937 года грымалі ўдзел у мітынгах, дзе першым патрабаваннем было: роспуск сейма, назначэнцаў, увядзенне новай дэмакратычнай канстытуцыі і выбарчай сістэмы і назначэнне новых выбараў. Пролетарыят Лодзі ўсеагульнай забастоўкай адказаў на роспуск гарадскога самакіравання, дзе фашысты не мелі большасці. Гэта забастоўка з'явілася шматтысячнай дэманстрацыяй пролетарыята за свабоду, мір і працу.

Сталінская Канстытуцыя і совецкі выбарчы закон дапамогуць народным масам Польшчы яшчэ больш зразумець сапраўднае значэнне перамог соцыялізма і натхняць іх на яшчэ больш рашучую барацьбу супроць фашызма.

ДА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА РЫХТАВАЦЦА ЗАРАЗ

(Агляд рабселькораўскіх пісем)

У жніўні нашы школы павінны быць гатовы да сустрэчы адпачыўшых за летнія канікулы дзяцей. Неабходна ні на адну хвіліну не адкладваць падрыхтоўчыя работы да навучальнага года.

Але ў радзе раённых арганізацый і нават цэнтральных (НКА, Белдзяржвыдавецтва і інш.) гэта работа пастаўлена яшчэ зусім нездавальняюча. У Даманавіцкім раёне, напрыклад, дагэтуль ні адна раённая арганізацыя не паклапацілася аб падрыхтоўцы школ да новага навучальнага года. Настаўнік Н. піша, што калі на нарадзе ў райана было пастаўлена пытанне аб рамонце школ, то сакратар райкома КП(б)Б т. Штэйнбах і старшыня РВК Гаўрусёў зусім выйшлі. Відаць, іх не турбуе тое, што ў валасовіцкай, азарыцкай, кабылышчанскай, шынчскай і ў іншых школах патрабуецца капітальны рамонт. Нічога не зроблена яшчэ, каб гэты рамонт пачаць. Усе новыя пабудовы ў Даманавічах, пачатыя яшчэ ў 1936 г., зараз закансервіраваны. Навучальна гісторыя з пабудовай валасовіцкай школы. Там хацелі пабудаваць будынак з дрэва, а потым з пэглы, а ўрэшце ні з дрэва, ні з пэглы нічога не пабудавалі. У старой-жа школе ніякіх умоў для нармальнай вучобы няма. Будынак школы зусім згніў.

Пад пагрозай зрыву знаходзіцца будаўніцтва новай школы ў в. Паплавак. Бярэзінскага раёна. Аб гэтым пішуць дырэктар школы тав. Ваўчок, група настаўнікаў і рабочых будаўніцтва. Будаўніцтва школы зрываецца з прычыны бяздзейнасці РВК і асабіста нам. старшыні т. Фіштумал, які непасрэдна адказвае за будаўніцтва і не забяспечыў яго будаўнічымі матэрыяламі.

Група настаўнікаў з Клічаўскага раёна зусім правільна ставіць у сваім пісьме пытанне аб парадку ў школах. Яны пішуць, што ў будынку несяцкай школы нячыста, паллога ўся дзіравая, вокны павыбіты, сцены ў павуцінні. Але ўсё гэта робіцца не выпадкова. Дырэктар школы Солтан свядома накіроўвае работу на падрыў школы, на разбурэнне яе. Пярвічнай партыйнай арганізацыі вядомы факты, што Солтан збіваў вучняў, п'янствуе, разбазарвае школьную маемасць, мае перапіску з варожымі элементамі, не вёў барацьбы, а дапускаў свядома антысавецкія настроі і гутаркі сярод вучняў. Мер-жа ніякіх не прынята.

У падрыхтоўцы да новага навучальнага года, у знішчэнні рэштаў дзякаўшчыны школам і настаўнікам павінна аказваць усямерная дапамога мясцовымі партыйнымі і совецкімі арганізацыямі. Але часта гэтыя арганізацыі па мясцах знаходзяцца ў старане ад школ або, што яшчэ горш, у асобных выпадках некаторыя работнікі падрываюць аўтарытэт совецкай школы.

Аб фактах такіх адносін паведамляе нас калектыў настаўнікаў юркаўскай НСШ Лагойскага раёна. На рахунак гэтай школы да сёнешняга дня не пераведзены грошы, асігнаваныя па бюджэту школы на рамонт і набыццё інвентару і вучэбна-наглядных дапаможнікаў. Старшыня Юркаўскага сельсовета, член партыі т. Праказаў не толькі не дапамагае школе, не бывае ў ёй, а кампраметуе настаўнікаў, абзывае іх гультаямі, нязнайкамі, груба адносіцца да школьнікаў. Аднойчы на мітынгу Праказаў заявіў: «У нашай школе настаўнікі нічога не робяць, яны вучаць дзяцей толькі «а» і «б». Школа працуе па праграме ворага народу Дзякава». Зразумела, што такія адносіны на-руку толькі класаваму ворагу.

У многіх школах яшчэ не ліквідаваны агіднасці, якія тварыліся і часам творацца стаўленікамі Даякава, варожымі людзьмі, падрываючымі комуністычнае выхаванне совецкай дзетвары. Выкрываць іх з усёй бязлітаснасцю, знішчыць вынікі іх шкоднай дзейнасці — наш штодзенны абавязак.

Ва урэцкай поўнай сярэдняй школе Слуцкага раёна, як пішуць настаўнікі, панае запіск крытыкі і самакрытыкі, існуе незаконнае налічэнне зарплаты, створаны цяжкія ўмовы для маладых настаўнікаў з мэтай іх выжыцця. Сродкі скарыстоўваюцца ў асабістых мэтах дырэктарам школы Коршукам, класы камплектуюцца з педалагічным падзелам дзяцей на «сельскіх» і «местачковых». Усё гэта ажыццяўляецца дырэктарам школы Коршукам, які, з'яўляючыся членам партыі, меў шчыльную сувязь з контрэволюцыянерам-нацдэмам Каленчыцам, а зараз шчыльна звязан з антысавецка настроеным настаўнікам Рудзікам, бацька якога знаходзіцца ў Польшчы. Школа правальвае падрыхтоўку да навучальнага года.

Пра аналагічны факт пішуць вучні-комсамольцы тт. Манёнак і Рамановіч, з даўжанскай НСШ, Клічаўскага раёна. Дырэктар гэтай школы Сенакосаў на справе патурае варожым настроям у школе, запіскае ўсякія спробы крытыкі, развальвае палітвыхаваўчую работу. У мінулым годзе школа працавала вельмі дрэнна, але гэта не ўлічана; ёсць пагроза, што падрыхтоўка да новага навучальнага года па гэтай школе можа быць сарвана.

Неабходна своечасова і з усёй рашучасцю выкрываць гэтую варожую дзейнасць, накіраваную перш за ўсё на зрыў падрыхтоўкі да навучальнага года.

Абсолютна трэба спыніць на становішчы некаторых школ наменшасцей. У гэтай галіне ворагі народу нямала нашкодзілі. Імкнучыся сарваць правільнае ажыццяўленне ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі. Таму на палянпшэнне работы школ наменшасцей павінна быць звернута самая сур'ёзная ўвага Наркомасветы і райана.

Загадчык селіцкай польскай пачатковай школы т. П. А. Валодзька зусім справядліва скарджэцца на недахват падручнікаў на польскай мове і на няўвагу да школы з боку Наркомасветы і Ушацкага райана. Гэта недапушчальная з'ява існуе не толькі ў адносінах селіцкай школы, такое-ж становішча і ў многіх іншых нацыянальных школах.

Мы прывялі толькі нязначную частку фактаў, якія сведчаць аб тым, што падрыхтоўка да новага навучальнага года яшчэ не разгорнута ва ўсю шырыню. Шмат такіх сігналаў паступае штодзень і ў Наркомасветы БССР, і ў райана, і ў рэдакцыі газет. Маруднасць і факты зрыву рамонту школ, пясвоечасовае забеспячэнне іх падручнікамі і наглядными дапаможнікамі, адсутнасць некаторых падручнікаў, адсутнасць новых праграм, неліквідаваная засмечанасць настаўніцкіх кадраў —усё гэта трэба разглядаць, як рэшты шкодніцтва ў сістэме народнай асветы. Многае ў ліквідацыі гэтых рэшт залежыць ад акруговых і раённых аддзелаў нарасветы, ад дырэктароў і загадчыкаў школ, ад дапамогі партыйных і совецкіх арганізацый.

У сваю чаргу Наркомасветы БССР, Белдзяржвыдавецтва і іншыя цэнтральныя арганізацыі павінны зараз-жа забяспечыць школы ўсім неабходным да новага навучальнага года.

Л. Х.

Учора ў Маскве адкрыўся міжнародны геалагічны кангрэс. НА ЗДЫМКУ— навуковы супрацоўнік Маскоўскага геолага-разведчага інстытута В. А. Тераеў за падрыхтоўкай выстаўкі к кангрэсу—рэстаўрацыяй шкілета эпісматэрыя (вымершага вадзянога насарога-пабагора). Фото В. Зацкага (СФ).

ПАВЫШАЦЬ ПАЧУЦЦІ СОВЕЦКАГА ПАТРЫЯТЫЗМА

Прафесар Ермоленка, утойваючы ад сваіх таварышоў свой чарговы навуковы артыкул па хіміі, надрукаваў яго ў фашысцкім журнальчыку.

Трэба нізка ўпасці, каб па-лакейску перадаць сваю навуковую работу знішчальнікам культуры, краіне фашысцкага варварства, якая праславілася дзікімі оргіямі вакол палаючых кастроў, у якіх спальваліся творы лепшых розумаў чалавецтва — Маркса і Леніна, Гейне і Горкага, лепшыя творы класікаў марксізма-ленінізма, філасофіі, літаратуры і мастацтва.

На жаль, сярод навуковых работнікаў БДУ гэта не першы выпадак кампраметацыі высокага звання совецкага вучонага.

Яшчэ ў 1935 годзе прафесар біялагічных навук Годнеў надрукаваў свой артыкул «Вызначэнне флярафіла» ў нямецкім часопісе. У прафесара Годнева ўсё-ж хапіла мужнасці раскрытыкаваць свой учынак перад калектывам, а ў Ермоленкі нехапіла чэснасці, каб нават прызнацца ў гэтым.

Несовецкі ўчынак прафесара Ермоленкі вельмі павучальны. Ён сведчыць перш за ўсё аб тым, што ў калектыве навуковых работнікаў БДУ не ведаюць, чым жыве кожны навукозы работнік у паасобку, якія яго творчыя планы, над чым ён працуе. Партыйная арганізацыя не лічыла патрэбным весці выхаваўча-палітычную работу сярод навуковых работнікаў. Наогул тут баяліся гаварыць аб выхаваўчай рабоце. Моў, як гэта вучоных людзей выхоўваць. Таму кожны навуковы работнік жыў сваім замкнутым мірком. Стварылася каставасць, адарванасць адзін ад аднаго. Вострыя пытанні міжнароднага і ўнутранога становішча ніколі не ўзнімаліся. Гэты кансерватызм хітра культываваў зараз выкрыты вораг, былы рэктар універсітэта Кучынскі. Ён і яго прыбліжоныя атручвалі контррэволюцыйным ядам атмасферу ў БДУ, маючы пэўную стаўку на выпуск нядобраякасных кадраў.

Было-б памылкай сказаць, што БДУ ўжо ачысціўся ад маскіруючыхся ў тогах вучоных варожых людзей. Вось прафесар хіміі Змачынскі. Да яго ва універсітэце праяўляюць вельмі многа цярпення і ён, спекулюючы гэтым давер'ем, праводзіць у сваёй дзейнасці несовецкую лінію. У сваіх лекцыях гэты вучоны свядома ставіць студэнтам даволі падазроныя пытанні. На выпускных экзаменах высветлілася, што студэнты, якія вучыліся ў Змачынскага, зусім не маюць марксісцка-ленінскага разумення аб электроннай тэорыі. Аказалася, што прафесар у сваіх лекцыях проста абышоў гэтыя пытанні. Такі прадмет, як хімія, ён ухітрыўся чытаць па-за ўсякай сувяззю з жыццём.

Змачынскі дайшоў да такой наглаcці, што ў сваім выкладанні выкінуў класічную табліцу вялікага рускага вучонага-хіміка Мендзелеева і склаў сваю табліцу, якая супярэчыць тэорыі Мендзелеева.

Ва універсітэце ведалі пра ўсё гэта, але своечасова не разбілі ўсе гэтыя варожыя манеўры. Той-сёй проста стараўся апраўдаць усе гэтыя агіднасці. Напрыклад, калі абмяркоўваліся паводзіны Ермоленкі, выступіла дацэнт матэматыкі Лукомская з безадказнай заявай, быццам у нас не так быстра друкуюцца навуковыя работы. Гэта ў той час, калі 43 работы самога-ж Ермоленкі друкаваліся ў совецкім друку і толькі потым ён сваю чарговую працу рашыў прадаць Германіі.

У БДУ працуе каля 100 навуковых работнікаў, у большасці сваёй маладых, вылучэнне і выхаванне якіх пакуль яшчэ вельмі слабае. Задача заключаецца ў тым, каб няспынна і сістэматычна працаваць з маладымі кадрамі, расціць і выхоўваць іх, павышаць пачуццё совецкага патрыятызма.

Н. ГАРНЫ.

ПАРТЫЙНАЯ ПРАПАГАНДА— У ЦЭНТРЫ УВАГІ ПАРТЫЙНЫХ СХОДАЎ

Па партыйных арганізацыях Кагановіцкага раёна прайшлі партыйныя сходы, прысвечаныя вынікам XVI з'езда КП(б)Б. Гэтыя сходы на аснове рашэнняў з'езда абмеркавалі становішча партыйна-палітычнай работы ў кожнай партыйнай арганізацыі. Абмяркоўваючы вынікі XVI з'езда КП(б)Б, комуністы асабліва востра крытыкавалі парткомы і райком за маруднасць перабудовы партыйнай прапаганды.

Падводзячы вынікі гэтых партыйных сходаў, можна з упэўненасцю сказаць, што справа палітычнай асветы не стала яшчэ ў цэнтры ўвагі многіх партыйных арганізацый. Пераважная колькасць гурткоў працуе яшчэ дрэнна. Комуністы ў сваіх выступленнях указвалі, што не гледзячы на прынятыя канкрэтныя рашэнні на справаздачна-выбарчых партыйных сходах, а таксама і на раённай партыйнай канферэнцыі аб перабудове работы гурткоў, аб увядзенні планавасці, тэрміноў вучобы большасць гурткоў пралаўжае яшчэ таптацца на месцы, не дабраўшыся да Кастрычніцкага перыяда. Партыйная сетка і на сёння яшчэ па-сапраўднаму не пераключылася на вывучэнне гісторыі партыі. У гуртках па гісторыі партыі ў большасці займаюцца бягучай палітыкай.

Галоўнай прычынай гэтага, як указвалі ў спрэчках комуністы, з'яўляюцца няўважлівыя, а часамі пагардлівыя адносіны да справы пастаноўкі партыйнай вучобы з боку сакратароў пярвічных парт-арганізацый, а таксама з боку райкома і гаркома.

На ўсіх партыйных сходах комуністы ўказвалі на маючыяся і зараз факты несур'ёзнага падбору прапагандыстаў. Прапагандысты ў радзе выпадкаў прыходзяць на заняткі непадрыхтаванымі, не ведаюць сваёй аўдыторыі, не цікавяцца падрыхтоўкай слухачоў да заняткаў.

Такія адносіны саміх прапагандыстаў да партыйнай вучобы рэсхаладжваюць слухачоў сеткі партыйнай асветы, знижаюць дысцыпліну, наведванне заняткаў. На фабрыцы імя Тэльмана, цагельным заводзе № 1, фабрыцы «Кастрычнік» часта заняткі зрываюцца па віне прапагандыстаў.

Сакратары парткомаў, парторгі і зараз яшчэ з'яўляюцца рэдкімі гасцямі на партыйных занятках. Пытаннямі зместу партыйнай вучобы большасць сакратароў парткомаў не цікавяцца. З членамі партыі ў перыяд паміж заняткамі ніякай работы не вядзецца. Парткомы ў лепшым выпадку звяртаюць увагу на пытанні арганізацыйнага парадку, пытанні наведвання комуністамі партыйных школ і г. д. Нават партарганізацыі фабрыкі «Кастрычнік», імя Кагановіча, імя Куйбышэва, якія ў свой час займаліся пытаннямі прапаганды, пытанні зместу, сутнасці партыйнай асветы яшчэ не ўзнялі. А яны лічацца ў райкоме не на апошнім месцы па пастаноўцы партпрапаганды.

Даходзіць да таго, што нават устаноўленыя дні партыйнай вучобы зрываюцца. У дні паліт- і партвучобы праводзяцца рад іншых мерапрыемстваў — сходы, нарады па розных пытаннях і т. д.

19 чэрвеня, у дзень партыйнай вучобы, райком партыі праводзіў сход агітараў раёна. Партвучоба была сарвана. 25 чэрвеня адбываўся раённы партыйны актыў, партсетка не працавала.

Райком партыі зараз праводзіць паўторную праверку прапагандыстаў. Праверка выяўляе рад людзей, непадрыхтаваных да вядзення партыйнай прапаганды. Вялікая група прапагандыстаў Кагановіцкага раёна—гэта маладыя члены партыі, якія не маюць вопыту прапагандысцкай і партыйнай работы. Яны адчуваюць асаблівую патрэбу ў пастаяннай металычнай дапамозе, у добра арганізаванай кансультацыі па тэмах, якія праходзяць у гуртку, у пастаянна дзейнічаючым пропсемінары.

Гісторыя партыі выкладаецца без сувязі з гісторыяй краіны, адарвана ад палітычнай і эканамічнай абстаноўкі таго ці іншага перыяда. Работа гурткоў праводзіцца схаластычна. Большасць прапагандыстаў слаба валодаюць методыкай падачы матэрыялаў. Заняткі вядуцца ў радзе выпадкаў раскідана і бессістэмна. Гэта можна праілюстраваць становішчам гуртка па гісторыі партыі ў Наркаммясцпроме, на фабрыцы імя Тэльмана і інш.

Трэба адзначыць, што калі было апублікавана пісьмо таварыша Сталіна ўкладальнікам падручніка па гісторыі ВКП(б), гарком і райком правялі некаторую работу па растлумачэнню прапагандыстам, слухачам партыйнай сеткі гэтага гістарычнага пісьма. Як па гаркому, так і па лініі райкома былі распрацаваны канкрэтныя мерапрыемствы па перабудове работы партсеткі, былі прадугледжаны рад мерапрыемстваў па арганізацыі дапамогі прапагандыстам.

На правядзімых нарадах прапагандыстаў, таксама на сходах слухачоў гурткоў, прысвечаных абмеркаванню пісьма таварыша Сталіна, агалашалі гэтыя рашэнні. Гарком намеціў правесці цыкл лекцый па дванаццаці тэмах і перыядах, згодна пісьма таварыша Сталіна. Быў распрацаван план кансультацый, таксама і лекцый па гісторыі СССР. Гарком у сваёй пастанове запісаў спецыяльны пункт аб падрыхтоўцы для школ і гурткоў па гісторыі ВКП(б) указальнікаў літаратуры, неабходнай прапагандыстам для вывучэння эканамічнага і палітычнага становішча краіны ў адпаведныя перыяды гісторыі нашай партыі. Мерапрыемствы гаркома, таксама і райкома як прапагандысты, так і слухачы віталі. Аднак да гэтага часу гэтыя рашэнні асталіся на паперы.

Пярвічныя арганізацыі, следуючы прыкладу гаркома і райкома, пытанням партыйнай вучобы не адводзяць яшчэ належнага месца ў партыйнай рабоце.

Гарком павінен зацвердзіць ім план пераўтварыць у жыццё. Неабходна арганізаваць сапраўдную дапамогу прапагандыстам.

На нарадах прапагандыстаў была выказана думка, падтрыманая, да-рэчы, гаркомам партыі, аб разгрузцы прапагандыстаў для заняткаў на пропсемінарах.

Прапагандысты на партсходах прыводзілі рад фактаў аб тым, што з-за частых адрываў іх ад прапагандысцкай работы, з-за перагружанасці яны не маюць магчымасці працаваць па першакрыніцах—творах Леніна і Сталіна. Неабходна стварыць усе ўмовы для прапагандыстаў у падрыхтоўцы іх да заняткаў. Нельга іх нагружаць іншымі даручэннямі. Прапаганда марксізма-ленінізма — важнейшы, пачэсны абавязак комуніста.

Партсходы, прысвечаныя вынікам XVI з'езда КП(б)Б, яшчэ раз паказалі, наколькі вялікае жаданне комуністаў узброіць сябе вучэннем Маркса—Энгельса — Леніна — Сталіна. Комуністы гараць жаданнем павысіць свой ідэйна-тэарэтычны ўзровень. Неабходна, каб партыйныя арганізацыі на справе забяспечылі перабудову сеткі партыйнай асветы, арганізавалі па-сапраўднаму партыйную прапаганду.

ЛІЎШЦЦ, РЫЎКІН.

В. КАЛЕСНІК

ШПІЁНСКІ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ*)

(Трацкісты на службе фашысцкіх разведак)

На сакавіцкім Пленуме ЦК ВКП(б) таварыш Сталін, гаворачы аб рэзервах трацкісцкай банды шпіёнаў, шкоднікаў, дыверсантаў за межамі СССР, указаў на трацкісцкі контррэволюцыйны інтэрнацыянал, «які састаіць на дзве трэці з шпіёнаў і дыверсантаў. «Ці не ясна,—гаварыў таварыш Сталін,—што гэты шпіёнскі інтэрнацыянал будзе вылучаць кадры для шпіёнска-шкодніцкай работы трацкістаў?»

З часу сакавіцкага Пленума ЦК ВКП(б) прайшло нямногім больш чатырох месяцаў, і кожны дзень прыносіць усё новыя і новыя пацверджанні слоў таварыша Сталіна. Як ні стараюцца фашысцкія разведкі ўтоіць сапраўдны твар сваіх трацкісцкіх найміт, ім гэта не ўдаецца. Трацкісцкі шпіёнскі інтэрнацыянал выкрыт перад усім светам як шайка агентаў-правакатараў фашысцкіх разведак.

Гнусная дзейнасць шпіёнскага інтэрнацыянала трацкістаў паказвае, што фашысцкія дзяржавы перайшлі да новых прыёмаў барацьбы супроць СССР і сусветнага рабочага руху, што яны ствараюць свой шпіёнска-правакатарскі цэнтр шляхам укамплектавання яго трацкісцкімі кадрамі.

Усюды, куды толькі дастаюць шчупальцы фашысцкіх разведак, апошнія імкнуцца насадзіць свае трацкісцка-шпіёнскія шайкі. Фашысцкія разведкі ўскладаюць на трацкісцкі шпіёнскі інтэрнацыянал спецыяльныя задачы.

Трацкістам даручаецца весці правакатарскую работу ў рабочым класе з мэтай узарваць знутры народны фронт, паслабіць растучы ўплыў комуністычных партый, арганізаваць пяспынную кампанію паклёпу і ўкавання супроць Совецкага Саюза, весці па заданнях фашысцкіх разведак шпіёнскую, дыверсійную, тэрарыстычную дзейнасць.

На чале шпіёнска-трацкісцкіх груп стаяць асобы, даўно зарэкамендаваўшыя сябе як подлыя рэнегаты, правакатары і шпіёны.

Напрыклад, у Югаславіі трацкісцкую групу ўзначальвае нехта Цыліг, італьянскі шпіён і адначасова агент югаслаўскай ахранкі. На чале трацкісцкай «Групы інтэрнацыяналістаў-комуністаў Германіі» стаяць зіноўеўскія выродкі Рут Фішэр і Маслоў. Рут Фішэр цесна звязана з агентам Гітлера—французскім фашыстам Дорыё, а Маслоў з'яўляецца агентам Гестапо. У Нарвегіі дзейнічае актыўнейшы трацкіст Олаф Шэфло—рэнегат, саюзнік здрадніка Бухарына. Гэта ён разам з атаманам бандыцкай шайкі Троцкім, па заданню Гестапо арганізаваў пасылку шпіёнаў у Совецкі Саюз. У Амерыцы трацкісцкімі справамі ведае вядомы жулік Істмэн, які па заданню прыхільніка Гітлера—фашыста Хэрста ў яго газетах паклёпнічае на рабочы клас СССР. Уся гэта трацкісцкая мразь, якой верхаводзіць обер-шпіён Троцкі і яго парастак—Седоў, аб'ядная ў міжнародную шпіёнскую арганізацыю, кіруемую германскай Гестапо, японскай, італьянскай і інш. разведкамі.

Зразумела, чаму «міжнародная» канферэнцыя трацкістаў, скліканая летам 1936 г. для арганізацыі 4-га інтэрнацыянала, не апублікавала прозвішчаў тых 15 «дэлегатаў», з якіх яна складалася.

Гэта было-б нязручна фашысцкім разведкам, бо кіраўнікі «секцый» трацкісцкага шпіёнскага інтэрнацыянала знаходзяцца на жалаванні ў тайнай паліцыі фашысцкіх дзяржаў і ўжо выкрыты рабочымі арганізацыямі як правакатары, злейшыя ворагі працоўных, ворагі міжнароднай дэмакратыі.

Для маскіроўкі сваёй шпіёнска-падрыўной работы трацкісцкія агенты фашысцкіх разведак выступаюць пад гучнымі «рэволюцыйнымі» назвамі, разлічанымі на ашуканства рабочых: у Францыі яны імянуюць сваю шайку «Інтэрнацыяналісцкай рабочай партыяй», у Іспаніі—«Рабочай партыяй аб'яднаных марксістаў» (ПОУМ), у Бельгіі—групай «Сацыялістычнага рэволюцыйнага дзеяння» і т. д.

Як-жа дзейнічаюць трацкісцкія шпіёны ў асобных краінах?

***

Увага ўсяго свету ў сучасны момант прыкавана да гераічнай барацьбы іспанскага народу, адстойваючага сваю свабоду і незалежнасць ад інтэрвенцыі германскіх і італьянскіх фашыстаў. Ужо пэлы год усе спробы германа-італьянскіх фашыстаў пакарыць Іспанію, захапіць Мадрыд разбіваюцца рэспубліканскай арміяй, створанай, абучанай і аснашчонай урадам народнага фронта.

З кожным днём усё больш і больш маладзеюць сілы Іспанскай рэспублікі, кожны дзень гераічнай барацьбы іспанскага народу паслабляе сілы мяцежнікаў. Недарма германа-італьянскія фашысты прыкладаюць усе старанні, каб узарваць знутры Іспанскую рэспубліку, і ў першую чаргу крыніцу яе дзейснай сілы—народны фронт. Для гэтага фашысцкія дзяржавы накіравалі ў Іспанію сваіх найбольш вопытных агентаў, якія ўсю сваю шпіёнска-дыверсійную работу сканцэнтравалі ў трацкісцкай арганізацыі ПОУМ. Тут яны, пад верхаводствам старога шпіёна, аднаго з кіраўнікоў ПОУМ—Андрэ Ніна (б. сакратар Троцкага), арганізуюць пэлы рад правакацыйных выступленняў супроць іспанскага народу, рэгулярна перадаюць ген. Франко ваенна-палітычныя весткі, ажыццяўляюць шкодніцтва ў сістэме народнай гаспадаркі.

Атрымліваючы ад генерала Франко паведамленні аб рыхтуючыхся на франтах актыўных аперацыях, трацкісты прыстасоўвалі да іх свае правакацыйныя выступленні у тылу. Так, у момант пачатку італьянскага наступлення на Гвадалахару трацкісцкія выродкі арганізавалі ўзброенае выступленне пад Валенсіяй.

Крывавы путч 3—4 мая, наладжаны трацкістамі ў Барселоне і пацягнуўшы за сабой шматлікія афіры, супаў з пачаткам актыўных дзеянняў фашысцкіх інтэрвентаў супроць Більбао і па сутнасці скоўваў актыўную дапамогу Каталоніі Краіне Баскаў.

У Мадрыдзе пасля кожнай бамбардыроўкі горада трацкісцкія шпіёны асведамлялі па радыё генералаў-мяцежнікаў аб рэзультатах нападання і фактычна выпраўлялі прыцэл гармат мяцежнікаў на найбольш населеныя кварталы Мадрыда.

У радзе пунктаў рэспубліканскай тэрыторыі трацкісты асведамлялі мяцежнікаў аб падрыхтоўваемых ваенных аперацыях, аб перасоўванні войск, аб рыхтуючыхся атаках, чым наносілі велізарную шкоду гераічнай рэспубліканскай арміі.

У Валенсіі нядаўна была ліквідавана фашысцкая арганізацыя. Яна ставіла сваёй задачай у момант разгортвання наступлення ген. Франко падняць узброенае паўстанне і наладзіць разню рабочых. Па плану фашыстаў, яны павінны былі перш за ўсё захапіць радыё, адтуль ад імя быццам-бы камітэта народнага фронта заклікаюць рабочых у клубы прафарганізацый з тым, каб замкнуць іх там і знішчыць. Гэта фашысцкая арганізацыя была звязана з італьянцамі, і адным з кіраўнікоў яе з'яўляўся Эдуард Гарэ—главар валенсійскіх трацкістаў. Ён ведаў зборам сродкаў для фашысцкай арганізацыі і снабжаў дакументамі хаваючыхся фашыстаў.

На ўсім працягу існавання народнага фронта ў Іспаніі трацкісты, па прамому ўказанню Троцкага, выступалі супроць дэмакратычнай рэспублікі, прыкрываючыся хлуслівым заклікам да безадкладнай барацьбы за «пролетарскую рэволюцыю». Гэтымі правакатарскімі дзеяннямі трацкісты хацелі дабіцца развалу народнага фронта. Каталонскія трацкісты, жадаючы перашкодзіць збліжэнню анархістаў з комуністамі, узводзілі гнусны паклёп на інтэрнацыяльныя брыгады, гэтыя перадавыя часці міжнароднага пролетарыята.

Трацкісты самымі подлымі сродкамі зрывалі ўстанаўленне ў рэспубліканскай арміі дысцыпліны, правільную цэнтралізаваную пабудову армейскіх часцей, падпарадкаванне іх адзінаму камандаванню. Органамі грамадскай безапаснасці ў Іспаніі ў чэрвені 1937 г. раскрыт фашысцка-шпіёнскі цэнтр, кіруемы трацкістамі. Дакументы, выяўленыя пры вобыску трацкісцкай арганізацыі ПОУМ, і паказанні арыштаваных сведчаць аб тым, што трацкісцкая арганізацыя, кіруемая Нінам, была цесна звязана з генералам Франко і выконвала чыста шпіёнскую работу. Сярод затрыманых членаў арганізацыі ПОУМ фігуруе значная колькасць замежных разведчыкаў.

Іспанская газета «Ля ора» правільна піша, што раскрыццё трацкісцкага цэнтра шпіянажу «з'яўляецца велізарнай перамогай, выйгранай у фашызма».

***

Сярод заходнееўрапейскіх дзяржаў асаблівай увагай германскай Гестапо і італьянскай разведкі карыстаецца Францыя.

Заключэнне франка-совецкага дагавору аб узаемадапамозе, умацаванне абароназдольнасці Францыі, перамога народнага фронта і звязанае з ёю палепшанне матэрыяльнага становішча французскіх працоўных мас, а таксама велізарны рост уплыву французскай компартыі ўмацоўваюць сілы дэмакратыі ў Заходняй Еўропе і тым самым паслабляюць сілы сусветнага фашызма.

Гестапо засылае ва Францыю сотні сваіх агентаў і праз іх прабуе ўзарваць народны фронт, апаклёпнічаць СССР, дыскрэдытаваць франка-совецкі дагавор, распаліць грамадзянскую вайну ва Францыі. Германскія фашысты знаходзяць для гэтага прыхільнікаў не толькі сярод французскіх фашыстаў тыпу Дэ ля Рока, тыпу рэнегата фашыста Дорыё. Каштоўнейшай знаходкай з'явіліся для іх французскія трацкісты.

Агенты Гестапо і італьянскай разведкі абаснаваліся ў трацкісцкіх групках ва Францыі. Гэтыя трацкісцкія групы хаваюцца пад рознымі гучнымі назвамі накшталт «Інтэрнацыяналісцкай рабочай партыі», «Інтэрнацыяналісцкай комуністычнай партыі», групы «Што рабіць». Некаторыя з іх называюць сябе секцыяй «IV інтэрнацыянала».

Дзейнасць гэтых груп ні ў чым па сутнасці не адрозніваецца ад дзейнасці французскіх фашыстаў—рэнегата Дорыё і іншых фашысцкіх груп ва Францыі. Яны вядуць паклёпніцкую кампанію супроць Совецкага Саюза, спвярджаючы, што растаржэнне пакта аб узаемадапамозе паміж Францыяй і СССР і ўстанаўленне саюза з Германіяй з'яўляецца неабходнай умовай далейшага існавання Францыі. Гэта лінія трацкістаў ва Францыі літаральна прадыктавана Гестапо. Іменна-ж аб гэтым крычыць германская фашысцкая прэса і ў гэтым-жа напрамку дзейнічаюць германскія дыпламаты, дабіваючыся ад Францыі разрыву франка-совецкага пакта.

Галоўная задача трацкісцкіх шпіёнаў — гэта дыскрэдытацыя і ўзрыў адзінства народнага фронта.

Паклёпнічаючы на компартыю, трацкісты заклікаюць радыкалаў парваць сувязь з комуністамі. З другога боку, прыкрываючыся левымі фразамі, яны рэкамендуюць рабочым не чакаць якіх-колечы палянпшэнняў ад сацыяльнага законадаўства, якое абапіраецца на народны фронт.

Ідэйным натхняльнікам трацкісцкіх груп ва Францыі з'яўляецца пражжоны авантурыст і прахадзімец Суварын. Маючы за плячамі багаты зопыт здрады, з ганьбай выгнаны з Комуністычнага Інтэрнацыянала. Суварын, яры паслядоўца Троцкага, спецыялізаваўся на гнусным паклёпе супроць Совецкага Саюза.

У сваіх брудных брашурах, па заданню свайго шэфа-бандыта Троцкага, ён усхваляе забойц тав. Кірава і заклікае да новых тэрарыстычных актаў. Ён прагне ваеннага паражэння Совецкага Саюза. З гэтых брашур, поўных падлейшага паклёпу на СССР, на народны фронт гітлераўскія агенты ва Францыі — трацкісты чэрпаюць «ідэі» для сваёй шпіёнскай шкодніцкай работы.

Звернемся да **Амерыкі**. Амерыканскі рабочы рух за апошні год выходзіць з таго гуніка палітычнай індыферэнтнасці, куды яго завяла рэакцыйная вярхушка Амерыканскай федэрацыі працы. Арганізацыя камітэта вытворчых профсаюзаў, якія аб'ядноўваюць больш двух мільёнаў арганізаваных рабочых аўтамабільнай, сталеліцейнай і другіх галін прамысловасці, паспяховае правядзенне стачак у цэлым радзе гарадоў, масавы рух супроць вайны і фашызма, арганізацыя ў цэлым радзе штатаў рабоча-фермерскай партыі, усё растучы рух за ўстанаўленне адзінага фронта, рост компартыі, — вось факты, якія гаворацць аб палітычным росце рабочага класа Амерыкі.

Компартыі ЗША прыходзіцца весці лютую барацьбу з рэакцыйнымі сіламі амерыканскай буржуазіі, з трацкісцкімі шпіёнамі-правакатарамі.

Не маючы самастойнай арганізацыі, трацкісты ў Амерыцы праніклі ў сацыялістычную партыю і, прыкрываючыся партыйнымі білетамі членаў сацыялістычнай партыі, вядуць там сваю гнусную работу.

(Працяг у наступным нумары).

*) «Правда» ад 21 ліпеня.

ДЫРЭКТАР-САМАДУР І ЯГО ЗАСТУПНІКІ

У глушы Палесся за 30 кілометраў ад раённага пэнтра — Капаткевіч знаходзіцца невялікі лесапільны завод «Змычка». Працуе на ім больш ста рабочых. Апрача адной лесапільнай рамы тут устаноўлена некалькі цыркулярак і гонтарэзных варштатаў. Завод выпускае піламатэрыялы, гонту, клёпку і рад іншых відаў прадукцыі.

Як і па ўсіх прадпрыемствах, тут ёсць дырэктар. Розніца толькі ў тым, што ён не адпавядае свайму прызначэнню, ды к таму вялікі самадур. Гэты «начальнік» — прозвішча яго Дзямідка — лічыць, што яму ўсё дазволена рабіць так, як ён пажадае. Захацелася Дзямідку, каб яго швагер Кордун быў на заводзе загадчыкам кладовай — і ключы ад апошняй апынуліся ў Кордуна.

Калі на заводзе пабудавалі 5 новых двухкватэрных дамоў для перасялення ў іх сем'яў рабочых з старога, поўразваленага інтэрната, Дзямідка ў першую чаргу паклапаціўся аб сабе і сваім шэагру. Сам ён заняў двухкватэрны дом, а швагра пасяліў па суседству, у другім доме. З 18 рабочых сем'яў атрымалі кватэры толькі 6.

Частым гасцём тут бывае дырэктар Петрыкоўскага леспрамгаса Ломп, якому падпарадкаван завод «Змычка». З прыездам Ломпа на кватэры Дзямідка наладжваюцца шумныя п'янкі. Нядаўна гэты «госць» разам з Дзямідкам, напіўшыся п'янымі, вечарам пайшлі на завод і хацелі пусціць у ход лакамабіль, у той час, калі там нікога не было. Толькі наспеўшы на гэту п'яную кампанію качагар Яновіч прадухіліў аварыю. Аднойчы, едучы ў Капаткевічы, Дзямідка так напіўся, што па дарозе згубіў шубу і партфель з дакументам.

Навасёлкаўская партарганізацыя, членам якой з'яўляецца Дзямідка, і Капаткевіцкі райком партыі прайшлі міма гэтых фактаў. Прайшлі яны і міма факту здзекаў Дзямідкі з рабочага завода Чэчыка. Апошні звярнуўся аднаго разу да Дзямідкі з просьбаю даць яму падводу паехаць у раённую больніцу; пры гэтым Чэчык паказаў накіраванне ад мясцовага фельчара. Але Дзямідка і слухаць не захацеў.

— Многа вас такіх хворых знойдзецца, — сказаў ён грозна, — няма ў мяне транспарту для такіх паездак.

Пакрыўджаны Чэчык вымушан быў пайсці ў больніцу за 30 кілометраў пеша. З'явіўся ён тулы з тэмпературай 39. Яго адразу-ж паклалі ў палату, як цяжка хворага, дзе ён і праляжаў паўтара месяца.

Аб факце здзекаў з Чэчыка рабкор з завода напісаў у газету «Звязда». Пры расследванні допіса, які рэдакцыя накіравала райкому партыі, факты здзекаў поўнасцю пацвердзіліся. Але первічная партарганізацыя рэагавала на гэтыя факты па-сямейнаму. Дзямідка толькі папярэдзілі.

Праз некаторы час рабочы Чэчык зноў папрасіў у Дзямідкі падводу ў больніцу. Грозны дырэктар адказаў яму так:

— Падводы не дам, можаце пісаць на мяне зноў у газету.

Такім чынам, райком партыі аказаўся палітычна блізарукім і, па сутнасці, патурае зацыску крытыкі.

Р. ФРАЛОЎ.

Кіностудыя «Ленфільм» рыхтуе да выпуску новы фільм «Пётр 1» па сцэнарыю А. Талстога і В. Петрова (рэжысёр В. Петроў). НА ЗДЫМКУ — кадр з фільма — «Асамблея». Фото СФ.

ЗМАГАЦЦА З ФАЛЬСІФІКАТАРАМІ МАЛОЧНЫХ ПРАДУКТАЎ

Год таму назад на буйнейшым калгасным рынку сталіцы БССР (Віленскі крыты рынак) з лёгкай рукі сакратара Менскага горсовета тав. Казлоўскага быў закрыт малочна-кантрольны пункт. Большая палова малочных прадуктаў, якія прывозяцца для продажу ў горад, прадаюцца на гэтым рынку без усякага лабараторнага аналізу. Гэта дае магчымасць фальсіфікатарам шырока збываць нямоўраякаснае з рознай мешанінай малако і іншыя малочныя прадукты.

Перад горсоветам не раз ставілася пытанне аб хутчэйшым будаўніцтве малочна-кантрольнага пункта. На гэту справу адпушчаны і адпаведныя сродкі. Але горсовет ніяк не збіраецца адвесці пад будаўніцтва пункта месца ці вызваліць адпаведнае памяшканне. Такое становішча далей не можа быць цярпімым. Малако з'яўляецца важнейшым прадуктам харчавання насельніцтва і асабліва дзяцей, а таму павінна дасканала падвяргацца кантролю.

Н. ВІШНЕЎСКІ

УЗДЗЕЙНІЧАЙЦЕ НА НАШАГА СТАРШЫНЮ ЖАКТА

Мы, жыхары дома № 14/3 па Вольнай вуліцы (Менск), рашылі звярнуцца ў рэдакцыю з просьбай не адмовіць нам у надрукаванні нашага пісьма і ўздзейнічаць на старшыню нашага жакта № 7 т. Капланскага.

Капланскі зажрыў прыбіральню і памыйную яму ў двары нашага дома, не лічачы патрэбным адвесці таказыя ў іншым двары. Ніхто з нашых жыхароў не сушырэчыць супроць закрыцця ў двары прыбіральні пры ўмове, як гэта было абяцана Капланскім, перавесці яе ў суседні жактаўскі двор, дзе змяшчаюцца толькі канюшні гэтага жакта.

Цяпер жыхары вымушаны хадзіць з памыйнымі вёдрамі па вуліцах Вольнай і Нова-Мясніцкай у пошуках двара, дзе-б ім дазволілі выліць памыі. Нярэдка натыкаемся на лаянку з боку жыхароў іншых двароў.

Мы лічым зусім законным наша патрабаванне неадкладна прыступіць да будаўніцтва прыбіральні ў суседнім жактаўскім двары і, пакуль гэта не будзе пабудавана, адкрыць прыбіральню ў двары нашага дома.

Жыхары жакта № 7—следуе 18 подпісаў.

ЗДАРЭННЕ

Шофер-забойца. Раніцой 20 ліпеня шофер Л. Ф. Тэро выехаў на няспраўнай грузавой машыне. Праязджаючы скрыжаванне—рог Совецкай і імя Фрунзе, парушыўшы правілы вулічнага руху, наскочыў на праходзячага ў гэты час вуліцу гр Дамброўскага. Апошні задаўлен на смерць.

Шофер-забойца Тэро арыштаван і прыцягваецца да крымінальнай адказнасці.

СЛОВА ЗА ПРАКУРОРАМ

Калгас «Завет Ільіча», Бродаўскага сельсовета, Барысаўскага раёна, невялікі па сваіх размерах. У ім налічваецца ўсяго 68 гаспадарак. Ён мае свой паравы млын, крупарушку, лесапілку, абодную майстэрню і цагельны завод. Нават пры дрэннай рабоце гэтых прадпрыемстваў у 1936 годзе яны далі прыбытку калгасу больш 40 тысяч рублёў. Але-ж з-за безгаспадарчасці і злоўжываванняў старшыні калгаса Азерскага калгас не разлічыўся з калгаснікамі па працадніях грашыма, мае запазычанасць розным прадпрыемствам і ўстановам каля 10 тысяч рублёў, не мае нічога на рахунку ў банку.

На працягу паўтарагадовай работы на пасадзе старшыні калгаса Азерскі зажымаў крытыку і самакрытыку. Калі калгаснікі Істоменка Антон і Грыневіч Алесь у мінулым годзе папрабавалі пакрытыкаваць Азерскага, ён, доўга не думаючы, паставіў пытанне аб выключэнні гэтых людзей з калгаса. Задумана — зроблена. І 12 лістапада іх выключаюць з калгаса, прыпісваўшы Істоменку і Грыневічу «развал дысцыпліны».

Азерскі не толькі выключаў з калгаса, але стаў на шлях масавага незаконнага штрафавання калгаснікаў. Амаль на кожным пасяджэнні праўлення штрафаваліся калгаснікі (часта без зацверджання агульнага сходу калгаснікаў). 4 лістапада мінулага года калгасніка Сабалеўскага Міхася аштрафавалі два разы па пяць працадзён. Назаўтра, 5 лістапада, аштрафавалі пяць чалавек ад 3 да 5 працадзён.

Толькі за 1936 год Азерскі атрымаў з калгаса два кабаны, два бараны і адну карову, і ўсё гэта бясплатна.

Паласаваўся і старшыня Бродаўскага сельсовета тав. Капман. Ён узяў сабе ў канны 1936 года кабана вагой 65 кілограмаў, а грошай да гэтага часу не заплаціў.

Для Азерскага ніякія законы не існуюць. На працягу 1936 года апрача працадзён ён атрымліваў па 10% ад неземляробчых заработкаў (?!). На 1937 год гэтая незаконная плата скасавана. Але Азерскі знайшоў другія металы абкрадвання калгаса. Ён устанавіў сабе зарплату — 150 руб. і 45 працадзён у месяц.

Апетыт Азерскага не абмяжоўваецца зарплатай і працаднямі. Ён прыкладвае сваю шкодную руку да калгасных грошай і памольнага збору. Рэвізійная камісія выявіла растрату за Азерскім на 1.184 руб. Памольным зборам ён распараджаўся, як сваёй уласнасцю. На млыне выяўлена растрата 50 пудоў памольнага збору.

Гэтым варожая дзейнасць Азерскага не абмяжоўваецца. Каб паларваць моц калгаса, ён даў загад паліць аграмаджаныя калгасныя будынкі. Толькі за апошні час у топках паравога калгаснага млына спалена восем калгасных будынкаў.

Аб усіх гэтых злачынствах у калгасе «Завет Ільіча» было вядома загадчыку райза тав. Капману і былому старшыні барысаўскага райвыканкома тав. Баранчыку. Але меры не былі прыняты.

БАРАНОЎСКІ.

БУДНІ ЛАГЕРНАЙ ВУЧОБЫ

СНАЙПЕРЫ

Пустэльнае поле. Бясформеныя груды павалу, трухлявыя пні, імшыстыя каменні, нявысокія ўзгоркі бурай зямлі. Ніякіх алзнак прысутнасці стралкоў. І ўсё-ж такі... то і справа палохаюць цішыню прасторaў адрывістыя гукі выстралаў. За ледзь прыкметнымі мішэнямі клубіцца пыл над павалам, пнямі, узгоркамі зямлі, успыхваюць і таюць ледзь прыкметныя тучкі дыму.

Але вось выстралы змоўклі. Гучна спявае трубач.

Адбой.

Поле ўміг ажывае. Ля мішэней вырастаюць фігуры паказчыкаў, сігналізуючых аб попаданнях. Каля павалу ціёў нібы з пад зямлі з'яўляюцца байцы. Гэта—снайперы — звышметкія стралкі. Між іншым паслухайце аб рэзультатах, яны дапамогуць больш наглядна ўявіць, што такое снайпер. У трохстах метрах ад лініі агню стаіць шчыт з вузкай шчылінай 20 х 20 сантыметраў. Умоўна гэта байніца. У ёй на 5—6 секунд з'явілася цэль. На трэцяй секундзе снайпер Бойка, былы брыгадзір з калгаса «Прабуджэнне», Смалявіцкага раёна, першай куляй паражае цэль.

У 700 метрах сярод густой зелені травы з'яўляецца амаль непрыкметная цэль — «ручны кулямёт на агнявой пазіцыі». Не далей, як на чацвертай секундзе цэль знікае, паражоная куляй, пушчанай комсамольцам-снайперам Кандрашовым.

Тав. Размоўка, былы калгаснік Смалявіцкага раёна, страляе таксама па кулямёту. На трэцяй секундзе пасля з'яўлення цэль падае, паражоная ў самым пэнтры куляй снайпера. Тав. Пінчук страляе ў працівагазе. Мішэнь — невялікая цёмная пляма ў 100 метрах. За 25 секунд Пінчук робіць 3 выстралы. Кулі акуратна дзіравяць мішэнь — усе ў коле з лічбай 10. 30 з 30 магчымых. Побач з Пінчуком таксама ў працівагазе страляе снайпер з двума трыкутнікамі на пятліцах. Гэта адзялёны камандзір тав. Даўгалашцеў. За тыя-ж 25 секунд ён робіць пяць выстралаў; рэзультат — 48 з 50 магчымых.

Так страляюць амаль усе стралкі з падраздзялення, якім камандуе комуніст Гысеў. Выдатных майстроў меткага агню выхоўвае соцыялістычнай радзіме Чырвоная Армія, якая метка будзе разіць ворага.

П. ВАЛЬД.

БАРЫСАЎСКАМУ ШКЛОЗАВОДУ ПРЫСВОЕНА ІМЯ ФЕЛІКСА ДЗЕРЖЫНСКАГА

ЦВК БССР задаволіў хадайніцтва рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічных работнікаў барысаўскага шклозавода і райвыканкома і прысвоіў шклозаводу імя Фелікса Дзержынскага. (БЕЛТА).

З БАСКАМІ ПАВІННЫ ІГРАЦЬ ЛЕПШЫЯ ФУТБАЛІСТЫ БССР

20 ліпеня на стадыёне «Дынама» адбыўся футбольны матч паміж зборнай БССР, намечаны Камітэтам па справах «Тэмп». Матч скончыўся з лікам 9:1 у карысць Баку.

Гэта паражэнне зборнай каманды даказвае яшчэ раз, што склад зборнай БССР, намечаны камітэтам па справах фізкультуры пры СНК БССР да сустрэчы з баскамі, з'яўляецца далёка не добраякасным.

У такім слабым складзе зборную каманду БССС для сустрэчы з адным з лепшых ігракоў свету — камандай баскаў выпускаць немагчыма.

Камітэту па справах фізкультуры пры СНК БССР патрэбна вылучыць у склад зборнай каманды лепшых футбалістаў.

І. МІН.

Удзельнікі фізкультурных парадаў вярнуліся ў Менск

Учора ў Менск вярнуліся беларускія фізкультурнікі, якія прымалі ўдзел у маскоўскім і ленінградскім фізкультурных парадах.

На вакзале делегацыю ўрачыста сустракалі фізкультурныя арганізацыі горада Менска, дзе ім былі прыпаднесены кветкі.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

СЕННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО:

Памяшканне Белдзярждрамтэатра | гастролі Маскоўскага тэатра імя МОСПО
МЯЦЕЖ
Пачатак у 8 г. веч.
Білеты ў касе тэатра з 12—2 і з 5 г. веч.

Гукавы кінотэатр «Чырвоная зорка» МАЛЕНЬКАЯ МАМА

Дзіцячы гукавы кінотэатр ЛЕНАЧКА І ВІНАГРАД

Гукавы кінотэатр «Пролетарый» АЙ.ГУЛЬ.

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал» ПУЦЕЎКА Ў ЖЫЦЦЁ

Гукавы кінотэатр «Спартак» ГОБСЕК

ДЗЯРЖЦЫРК
Парк імя Горкага (тэл. 22.725).
З 20 ліпеня гастролі адзінай жанчыны ў СССР—ілюзяністкі
Клео ДАРОЦІ
з яе 15 асістэнтамі-ліліпутамі.
7 — МОРЭНО — 7
веласіпедысты-фігурысты
Таксама ўдзельнічае ўся трупа
Пачатак у 9 гадзін веч.
Каса з 12—2 і з 5 гадз. веч.

Белдзяржтэатру оперы і балета ПАТРЭБНЫ ПАКОІ для прыязджаючых акторaў. Плата па згодзе. З прапановамі зварачацца па адрасу: пр Урыцкага і Карла Маркса, 13/15, да дзяжурнага, тэл. 21-834.

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 22 ЛІПЕНЯ:
8.30—«Апошнія паведамленні». 10.30—перадача для піянераў і школьнікаў. 16.05—літаратурная перадача. 17.00—кан. пэрт. 19.30—песні народаў СССР. 20.00—даклады і выступленні. 20.15—перадача ў дапамогу самаадукацыі. 20.30—ман. таж «Ледавы паход». 21.30—літаратурная перадача на яўрэйскай мове. 22.00—адрыўкі з опер. 23.00—«Апошнія паведамленні».

БЕЛКААПСАЮЗУ ПАТРАБУЮЦЦА кваліфікаваныя ПАВАРЫ на пастаянную работу ў раёнах
Зварачацца па адрасу: Менск, Совецкая, 43-13 трэці паверх, пакой № 40.

Наркамат соўгасаў БССР выказвае спачуванне сям'і і рабочаму калектыву соўгаса «Новыя Зялёнкі» па поваду смерці дырэктара соўгаса тав. МАРЧЭНКА Нікалая Фёдаравіча.

ДЗЯРЖАЎНАЕ СТРАХАВАННЕ САЮЗА ССР

Маемасць калгасаў, рабочых, служачых, калгаснікаў, аднаасобных сялян і іншых грамадзян можа быць ЗАСТРАХАВАНА Ў ДОБРААХВОТНЫМ ПАРАДКУ.
КАЛГАСЫ МОГУЦЬ СТРАХАВАЦЬ:
пасевы зернавых, бабовых і тэхнічных культур, ураджай садоў, ягаднікаў; коней, кароў, дробную жывёлу і інш. жывёл; пабудовы, абсталяванне, інвентар і інш. маемасць.
РАБОЧЫЯ, СЛУЖАЧЫЯ І КАЛГАСНІКІ МОГУЦЬ ЗАСТРАХАВАЦЬ
хатнюю маемасць і жывёлін.
За даведкамі і растлумачэннямі зварачацца ў раённыя і гарадскія страхавыя інспекцыі, а таксама да агентаў Дзяржстраха і ў Дзяржстрах БССР.

МЕНСКІ САЮЗУНІВЕРМАГ НКУГ СССР
(Совецкая, 59)
з 1 ліпеня ЗНІЖАНЫ ЦЭНЫ
НА НАСТУПНЫЯ ТАВАРЫ:

Трыкатажная бялізна	— 5 проц.
Верхні трыкатаж віскозны	— 5 проц.
Наскі мужчынскія	— 8 проц.
Панчохі жаночыя віскозныя	— 5 проц.
Панчохі і наскі дзіцячыя	— 5 проц.
Гатовае плацце—мужч. і жаночае	7—10 проц.
Бялізна — мужч. і жаночая	5—8 проц.
Дзіцячае гатовае плацце і бялізна	7—10 проц.
Галаўныя ўборы	5—10 проц.
Галантарэя ў сярэднім на	10 проц.
Музыкальныя інструменты · балалайкі, гармоні, гітары, мандаліны, баяны	ад 10 да 15 проц.
Школьныя прыпады — ранцы, пеналы, ручкі, пер'і і інш.	— 5 проц.
Цацкі	— 15 проц.
Футровыя галаўныя ўборы	— 5 проц.
Мэбля	— 7,5 проц.

КУПЛЯЙЦЕ ТАВАРЫ Ў МЕНСКІМ САЮЗУНІВЕРМАГУ

Беларускае аб'яднанне БЕЛКААПСЫРАВІНЫ пры Белкаапсаюзе
ВЯДЗЕ ЗАГАТОЎКУ УЦІЛЬСЫРАВІНЫ:
рыззя, макулатуры, гумовага абутку, касцей, пуху-пяра, шчаціны, конскага воласу, рог-сыравіны, кароткага валакна, лому каляровых металаў і іншых відаў.
ЗАГАТОЎКА ВЯДЗЕЦЦА п раз райзагі і сельпо ўсіх раёнаў БССР.
ЗАХОЎВАЙЦЕ ВАШ ХАТНІ ЎЦІЛЬ І ПРАДАВАЙЦЕ ЯГО СІСТЭМЕ СПАЖЫЎКААПЕРАЦЫІ.
ЦЭНЫ на ўцільсыравіну ПАВЫШАНЫ.

Назва гатункаў	Заготцана за кілограм
Гарадское сукно тонкае чысташэрснае	80 кап.
Гарадское сукно грубашэрснае	18 »
Сялянская чыстая шэрсяная вязь	55 »
Сялянскае чыстае шэрсяное сукно	35 »
Футра-аўчынны лоскут	18 »
Холшчавая веташ фарбаваная і нефарбаваная забруджаная	45 »
Холшчавая веташ нефарбаваная чыстая	50 »
Холшчавая веташ сарочка чыстая нефарбаваная	70 »
Веташ бавоўняна-папяровая	45 »
Ватнік	10 »
Рызсё-брак	07 »
Стары гумавы абутак	50 »
Пух-пяро курынае змешанае	1 р. 00 »
Пух-пяро гусінае	3 р. 50 кап.
Пух гусіны	10 р. 00 кап.
Папяровая макулатура зборная	10 кап.
Косць сталовая і палявая	12 кап.
Лом каляровых металаў	ад 45 кап. да 1 р. 43 кап.

Беларускае аб'яднанне Белкаапсыравіны.

ПАМЯТАЙЦЕ. Уціль — каштоўная сыравіна і яна неабходна раду галін прамысловасці.

У аддзел аб'яў званіце па тэл. 21-845

Гомельскі ўсебеларускі індустрыяльны тэхнікум будматэрыялаў абвяшчае НАБОР СТУДЭНТАЎ на 1937—38 навучальны год па першы курс.
Тэхнікум рыхтуе тэхнікаў-тэхнолагаў керамічнай прамысловасці. У тэхнікум прымаюцца асобы ва ўзросце ад 16 да 35 год, скончыўшыя нявоўную сярэднюю школу.
Курс навучання — 4 гады.
Заявы прымаюцца да 1 жніўня штодзённа за выключэннем агульных выхадных дзён (6. 12. 18. 24 і 30).
Да заявы прыкладаюцца: пасведчанне аб адукацыі, аўтабіяграфія, метрычны выпіс, 2 фотакарткі з завераным подпісам, пасведчанне аб ваенкаўскім і паштовых марак на 40 кап.
Іспыты будуць праводзіцца з 15 па 25 жніўня 1937 года па наступных дысцыплінах: роднай мове, гісторыі, матэматыцы, фізіцы і хіміі.
На іспыты з'явіцца па выкліку тэхнікума.
Іншагароднія забяспечваюцца інтэрнатам. Стыпендыя — па паспяховасці.
Адрас: Гомель, Ветраная вул., № 50. Тэхнікум будматэрыялаў.
ДЫРЭКЦЫЯ.

ВІЦЕБСКІ ВЕТЗААІНСТЫТУТ абвяшчае НАБОР студэнтаў на ВЕТЭРЫНАРНЫ І ЗААТЭХНІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТЫ, якія рыхтуюць ветэрынарных урачоў і заатэхнікаў вышэйшай кваліфікацыі.
Інстытут мае 25 добра абсталяваных кафедр, рэнтгена-кабінет, фізіка-тэрапеўтычнае аддзяленне і вучэбны соўгас. Прыём праводзіцца па агульных для ўсіх ВНУ правілах.
Прыём заяў да 1 жніўня. Іспыты — з 1 па 20 жніўня.
Усе студэнты забяспечваюцца інтэрнатам і стыпендыяй па паспяховасці. Адрас: Віцебск, Ветзааінстытут.

ВІЦЕБСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ МАСТАЦКАЕ ВУЧЫЛІШЧА абвяшчае НАБОР вучняў на 1937—38 навуч. год.
Курс навучання чатыры гады. Прымаюцца асобы ва ўзросце ад 15 да 25 год.
Да заявы патрэбна прыкласці хатнія мастацкія работы і наступныя дакументы ў арыгіналах: метрыку, атэстат аб скончэнні 7 класаў сярэдняй школы, даведку аб прыгоднасці здароўя да мастацкай спецыяльнасці, дзве завераныя з уласнаручным подпісам фотакарткі, аўтабіяграфію і паштовых марак на 40 кап. для адказу. Прыём заяў да 15 жніўня. Іспыты з 15 па 25 жніўня. Паступаючыя трымаюць іспыты па беларускай і рускай мовах, матэматыцы, грамадазнаўству і геаграфіі ў аб'ёме праграмы сямі класаў сярэдняй школы, а таксама спецыяльныя іспыты па мастацкіх дысцыплінах: рысунак з натуры, жывапіс (нацюрморт, акварэль).
Заявы з дакументамі дасылаць па адрасу: Віцебск, Валадарскага, 3/5, Мастацкае вучылішча. Прыбываючыя павінны мець пашпарт. Прынятыя забяспечваюцца інтэрнатам і стыпендыяй у залежнасці ад паспяховасці.
ДЫРЭКЦЫЯ.

ЧЫРВОНА-БЯРЭЖСКАМУ С.-Г. ТЭХНІКУМУ
ПАТРЭБНЫ ВЫКЛАДЧЫКІ
па наступных прадметах:
ГІСТОРЫІ, ПАЛІТЭКАНОМІІ І ЭКАНОМГЕАГРАФІІ—1 чалавек;
ФІЗІЦЫ І МАТЭМАТЫЦЫ — 1 чалавек;
НЯМЕЦКАЙ МОВЕ — 1;
АГРАНОМАЎ — 1
І ІНСТРУКТАР ФІЗКУЛЬТУРЫ — 1.
Аб умовах працы будзе паведамлена пісьмова. Заявы, аўтабіяграфіі з адпаведнымі дакументамі накіроўваць па адрасу: п. а Чырвоны Бераг, Жлобінскага раёна, с.-г. тэхнікуму.

Уп. Галоўлітбела № 1321. Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая, 63. Б. К. С.